# Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

http://niva.iig.pl
redakcja@niva.iig.pl

№ 49 (2586) Год L | Беласток, 4 снежня 2005 г. | Цана 2,00 зл.


10-е „Бязмежжа" ☞ 3



ЮРЫ ВАСІЛЮК ☞ 4





*А. Сакалоўская: Рыгор Барадулін — вялікі чарадзей мовы. Яго мова — гэта цэлы свет, новы, непаўторны, яшчэ неспазнаны, ён стварае свае, новыя словы, якія арганічна ўпісваюцца ў мову...*

Рыгору Барадуліну з паклонам за паэзію
Фота МІРЫ ЛУКШЫ

# Слоўныя дзівосы

**Рыгор Барадулін — народны паэт Беларусі. У Беларусі, як усюды і заўсёды, шлях паэта нялёгкі. Ён мусіць быць і праракам, несці людзям словы праўды і дабра, не спадзеючыся на іх ласку і ўдзячнасць. „Сам жа мусіш свой несці крыж, Узнясці на сваю Галгофу", — сказала пра аўтара на сустрэчы ў Беластоцкім універсітэце даследчыца Ала Сакалоўская. — „Я шчаслівая, што сорак гадоў ты і твая паэзія ёсць у маім жыцці. Я нізка схіляю галаву перад табою — Чалавекам, Грамадзянінам, сапраўды Народным Паэтам..."**

Кнігу „Ксты", выдадзеную ўжо ў пару тыражах, склалі Ала Сакалоўская і ксёндз Уладзіслаў Завальнюк (кандыдат гістарычных навук, магістр тэалогіі) з мінскага касцёла святых Сымона і Алены, а сфінансавалі яе прыхаджане гэтай рыма-каталіцкай парафіі (паэт з'яўляецца вернікам Уніяцкай царквы). „Ксты" — узор духоўнай паэзіі: „Беларусь адродзіцца Вераю".

— Напісаў „Ксты" вялікі майстра слова. Рыгор Барадулін — вялікі чарадзей мовы. Яго мова — гэта цэлы свет, новы, непаўторны, яшчэ неспазнаны, — кажа А. Сакалоўская. — Добра ведаючы будову беларускага слова, ён стварае свае, новыя словы, якія арганічна ўпісваюцца ў мову. І здаецца, што гэтае слова было, толькі ты яго не ведаў...

Слова „Ксты" — шматзначнае. Гэта і хрост (хрышчэнне), і крыжы, і пальцы, складзеныя каб перажагнацца. Перакцсціць — паблаславіць у дарогу, у войска, паблаславіць маладажонаў, хворага, нябожчыка.

Рыгор Барадулін не толькі піша па-беларуску, але і перакладае на розныя мовы свету. Праз яго паэзію Беларусь адкрываецца іншым народам і дзяржавам і, у сваю чаргу, узбагачаецца культурнымі набыткамі свету.

Ала Сакалоўская сцвердзіла, што пры складанні зборніка працавалася і цяжка, і лёгка. Лёгка таму, што высокая паэзія дае чалавеку моц і сілу, цяжка — бо павінна была выбраць з цудоўнага лепшае. Захапляецца вершамі Рыгора Барадуліна з таго часу, як пазнаёміў іх яе сваяк Уладзімір Караткевіч. Рыгор Барадулін — паэт унікальны. Ён піша як дыхае. Пра яго віртуознасць як майстра слова сказана шмат, а майстэрства слова спалучаецца ў яго з вялікай духоўнасцю. „Мой Барадулін — талерантны і непрымірымы, мудры і наіўны, пяшчотны і жорсткі". Кніга „Ксты" — кніга-малітва, кніга-роздум, кніга-споведзь, кніга-пакаянне. Гэта гімн Богу і Маме.

Кнігу „Ксты" вылучаў на Нобелеўскую прэмію ксёндз Уладзіслаў Завальнюк.

— Гэта вылучэнне і для ўсяе беларускае літаратуры, — заўважыў сціпла амаль 70-гадовы аўтар. — Гэта шмат значыць у час, калі на радзіме так знішчаюцца беларуская мова і культура.

Студэнтаў найбольш цікавіла сяброўства Барадуліна з вялікімі майстрамі слова Уладзімірам Караткевічам і Васілём Быкавым. „Караткевіч — пасланы Богам Беларусі. Мой брат, бацька, сябра". Барадулін разам з Васілём Быкавым стварылі разам дзве кнігі лістоў і твораў слова, дзе мастаком быў Быкаў, якім і быў ён па прафесіі, дасылаючы Барадуліну малюнкі са сваіх вымушаных падарожжаў па-за межамі бацькаўшчыны. Гучалі таксама пытанні наконт пачаткаў творчасці, вытокаў, прыёмаў, мовы. „Я настолькі натолены словамі Вушаччыны, што яны выходзяць з мяне як каменне". Улюбёныя паэты — Максім Багдановіч, Міхась Стральцоў, Анатоль Сыс. Барадулін, працуючы ў выдавецтве Мастацкая літаратура, вывеў у свет нямала маладых паэтаў. „Маладыя растуць. Парой адкрыцці робяць". Нашы маладыя творцы, м.інш. Юрка Буйнюк, сустрэчу з вялікім майстром паэтычнага роднага слова патрактавалі як нагоду паразмаўляць аб паэтычнай „кухні". Калі пішацца паэту? „Стан калі пішу — тады жыву. Калі не пішу — мне дрэнна, мне галава баліць". Ды найбольш баліць паэту галава, калі думае пра Айчыну. „Цемя нацыі — крывічы. Беларусы — цемя Еўропы. Па цемечку і б'юць. Гэта беларус павінен усведамляць. Сталінскія рэпрэсіі вынішчылі мозг нацыі. А цяпер да гэтага прыкладваецца Інтэрнэт і электронныя масмедыі, якія робяць капронавым мышленне і светаўспрыманне".

**Міра Лукша**

## Вера ў лепшае ☞ 2

Віктар Сазонаў

*Зусім нядаўна мяне з сябрамі міліцыя затрымала ля маёй роднай вёскі, дзе прайшло маё дзяцінства і дзе жыве мая матуля, каля магілак, дзе пахаваныя мае родныя. Высветлілася, што я не маю права туды прыязджаць без спецыяльнага дазволу, што там існуе своеасаблівая мяжа без мяжы...*

## Мінск — Варшава ☞ 2

Мацей Халадоўскі

*Анжаліка Барыс была ў Польшчы нядаўна ў чарговы раз. Як прызналася журналістам, памежныя службы ў Беларусі пагразілі ёй, што больш яе не выпусцяць. Гэта ўпісваецца ў выказванні прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі:*

*— У Беларусі не пражываюць ніякія палякі. Ёсць тут толькі палякі па паходжанні. Гэта нашы беларусы, нашы грамадзяне...*

## У Снежках ☞ 5

Аляксандр Вярбіцкі

*Калі ў Боцьках быў ранейшы войт, які быў звонку, недзе з Люблінскага, ён быў справядлівы да ўсіх. А калі настаў цяперашні, з Боцькаў, то ён спіхае вёскі з паўднёва-ўсходняй часткі гміны на далейшы план. Бо гэтыя вёскі галасавалі за Цімашэвіча. Міжваенны падзел на лепшую і горшую часткі Польшчы астаецца ў Боцькаўскай гміне беражна ахоўваемай традыцыяй...*

## Родам з Беласточчыны ☞ 9

Сяргей Чыгрын

*Язэп Дашута нарадзіўся ў 1890 года ў Саколцы на Беласточчыне ў мяшчанскай сям'і. Спачатку вучыўся ў Сакольскім 4-класным вучылішчы, а пасля ў 1911 годзе скончыў Віленскую духоўную каталіцкую семінарыю. Падчас вучобы быў актыўным сябрам гуртка беларусаў-семінарыстаў...*



## У Вільні ☞ 10

Леакадзія Мілаш

*Агляд жыцця і творчасці Уладзіміра Караткевіча зрабіла Леакадзія Мілаш, пасля прысутныя паглядзелі відэафільм „Рыцар і слуга". Час бяжыць няўмольна хутка. Здаецца нядаўна адзначалі 70-годдзе, група актывістаў ТБК здзейсніла вандроўку на Радзіму Уладзіміра Караткевіча ў Оршу, потым у Віцебск, наведалі магілу пісьменніка на Усходніх могілках у Мінску і перачытвалі яго творы...*



# Верым у лепшае

*Ужо каторы дзень запар Лукашэнка не вылазіць з блакітных экранаў беларускіх тэлевізараў. Ён і ранней меў звычку пазіраваць перад тэлекамерай. То прэзідэнт у калгасе вучыць вяскоўцаў правільна апрацоўваць палеткі, то на заводзе павучае працоўных як і што трэба рабіць, то ў чарнобыльскай зоне сам правярае ровень радыяцыі і сцвярджае, што там можна і трэба жыць... У многіх тэлеглядачоў нават узнікала пытанне, нашто нам міністэрствы і эканамічныя аддзелы, калі ўсюдыісны і разумны прэзідэнт мае адказы на ўсе пытанні. Як кажуць, і жнец, і касец, і на дудзе ігрэц. Але зараз, па колькасці тэлепаказаў яго смела можна ўносіць у знакамітую кнігу рэкордаў Гінеса. І зноў новыя адкрыцці, новыя заявы. Прэзідэнт заявіў, што народ ані разу не падвёў беларускую ўладу, асабліва асабіста яго. Агалосіў свой рэйтынг — 73-75%. Нагадаў і пра тое, што як нацыяналісты на чале з Шушкевічам прыйшлі да ўлады, усе рускія сядзелі на чамаданах, а ён, адзіны, хто ў беларускім парламенце галасаваў супраць развалу СССР. А яшчэ гісторыкі даведаліся з вуснаў першай асобы Беларусі, што беларусы і рускія ніколі не ваявалі, а на бітве беларускіх і расійскіх войскаў пад Воршай, больш было палякаў. (За каго ваявалі палякі не канкрэтызавалася.) Засталося толькі ўдакладніць, чаго расійскія войскі туды прыйшлі, і беларуская гісторыя будзе „даследваная" цалкам.*

*На гэтым новыя ідэі не скончыліся. Было заяўлена, што незалежнасць абвалілася на нашы галовы, і што беларусы ад рускіх адрозніваюцца тым, што мы хітрыя і перш чым што зрабіць — думаем. А нашаму прэзідэнту больш даспадобы людзі, якія разганяюцца і пайшлі.*

*А на старонках незалежнай прэсы іншыя ноты і другія словы. Там абмяркоўваюць новыя папраўкі ў заканадаўства, якія зноў палохаюць адказнасцю за... хіба што, за ўсё, пішуць пра ўціск на незалежныя СМІ, закрыццё палітычных партый і грамадскіх арганізацый. Распавядаюць пра палітвязняў, разгоны мітынгаў, арышты, затрыманні... Пра праблемы з Саюзам палякаў і Саюзам беларускіх пісьменнікаў... Пра стварэнне ўжо самімі ўладамі новага Саюза пісьменнікаў Беларусі. Напэўна хутка агалосіцца і прозвішча самага вялікага беларускага пісьменніка ўсіх часоў і народаў. Здагадайцеся хто гэта.*

*Больш дзесяці гадоў жыцця беларусы праіснавалі ў гэтай рэчаіснасці. Адны называюць гэты час тэатрам абсурду, іншыя не называюць ніяк. Хтосьці змушаны быў уцякаць за мяжу, а нехта сігануў туды ў пошуках лепшай долі. Адны бясследна прапалі, а іншыя жывуць у чаканні рэпрэсій. Некаторыя выбіваюцца з сілаў, каб іх голас пачулі, а іншыя ўжо згубілі апошнія сілы, скарыліся і маўчаць. Ямчэ цешаць сябе надзеяй, што яны маўчаць толькі да пары, да часу, але маўчаць. А многія людзі проста стаміліся. Зняверыліся, што можна нешта змяніць. Проста жывуць і чакаюць, што нехта за іх вырашыць агульныя праблемы.*

*У гэтыя выхадныя, на традыцыйных літаратурных чытаннях „Бязмежжа", якія штогод ладзяцца на Беласточчыне, слухаючы аповеды Яўгена Вапы і Міхася Андрасюка пра тое, як усталёўвалася савецка-польская мяжа, спазнаючы, з якімі праблемамі сутыкнуліся беларусы ў той пасляваенны перыяд, калі жыхары не маглі патрапіць ні да сваёй стадолы, ні да родных і блізкіх, бо іх раздзяліла граніца, мяне не пакідала думка, што ў нашай беларускай рэчаіснасці з тае пары нічога не змянілася. Зусім нядаўна мяне з сябрамі міліцыя затрымала ля маёй роднай вёскі, дзе прайшло маё дзяцінства і дзе жыве мая матуля, каля магілак, дзе пахаваныя мае родныя. Высветлілася, што я не маю права туды прыязджаць без спецыяльнага дазволу, што там існуе своеасаблівая мяжа без мяжы. А як вярнуўся з „Бязмежжа", у вушах гучаў вокліч Алега Латышонка. Ён, як пачуў пра забарону выкарыстоўваць у назвах беларускіх грамадскіх арганізацый і палітычных партый словы „беларускі" і „нацыянальны", схапіўся рукамі за галаву і з болем, што раздзіраў душу і сэрца, выдыхнуў: „Божа! Калі гэта скончыцца?!"*

*Супакоіўся я толькі тады, калі ўспомніў пра пярсцёнак цара Саламона, на якім былі напісаныя мудрыя словы: „Усё міне, і гэта таксама". Алег, не перажывай. Абавязкова скончыцца. Верым у лепшае. Усё будзе на веры нашай.*

**Віктар Сазонаў (Гродна)**



# Сітуацыя ў Бельскім павеце

*Пасля вайны Бельскі павет праходзіў частыя рэарганізацыі. 22 сакавіка 1952 года з яго быў выдзелены Сямятыцкі павет, а 22 жніўня 1953 года — Гайнаўскі. У 1967 годзе ў яго складзе былі два гарады і 22 грамады. У выніку адміністрацыйнай рэформы 1 чэрвеня 1975 года паветы былі ліквідаваны. Гэтае становішча доўжылася да 1 студзеня 1999 года, да новага адміністрацыйнага падзелу Польшчы на ваяводствы, паветы і гміны. Цяпер у Бельскім павеце дзве гарадскія гміны — Бельск-Падляшскі і Браньск — і шэсць гмін вясковых: Арлянская, Бельская, Боцькаўская, Браньская, Вышкаўская і Рудчанская, якія ахопліваюць 264 вёскі.*

*У Бельскім павеце ў палове мінулага года пражывала 60 917 асоб, з гэтага ліку палова ў гарадах: каля 27 тысяч у Бельску і 3,8 тысяч у Браньску. Шчыльнасць насельніцтва — 44 асобы на квадратны кіламетр — найбольшая ў параўнанні з суседнімі паветамі. Бельскі павет займае плошчу 1 382 кв. кіламетраў, з чаго амаль сто тысяч гектараў займаюць сельскагаспадарчыя ўгоддзі. З апрацоўкі зямлі ўтрымоўваецца каля 13 тысяч асоб (гэта амаль 36% з амаль 38 тысяч асоб, што жывуць з выконваемай працы). У павеце амаль дваццаць тысяч пенсіянераў.*

*Працэс эканамічнай трансфармацыі значна пагоршыў сітуацыю на рынку працы ў павеце. У канцы 2003 года ў Павятовай управе працы было зарэгістраваных каля трох тысяч беспрацоўных — гэта 9% ад ліку ўсіх працаздольных. Апрача таго маем дачыненне са скрытым беспрацоўем, асабліва на вёсках, дзе людзям без працы не хочацца рэгістравацца, каб не расходаваць грошай на білеты ў бельскую ўправу працы дзеля фіксацыі сваёй прысутнасці, калі працы такім людзям і так няма. Сітуацыя жанчын на рынку працы больш складаная, бо яны хутчэй трацяць працу і маюць большыя цяжкасці вярнуцца на працу. Працадаўцы ахвотней чым жанчын прымаюць мужчын, не заўсёды кіруючыся іх кваліфікацыямі і прафесіянальным вопытам.*

*Сітуацыя на рынку працы ўплывае на грамадскія паводзіны. У павеце 11% моладзі ва ўзросце 15-18 гадоў спажывае алкагольныя напоі ў трывожных памерах. За апошнія некалькі гадоў пастаянна расце лік п'ючай і ўпіваючайся моладзі. У 15% сем'яў выступаюць алкагольныя праблемы. У першым квартале г.г. на 16 віноўнікаў дамашняга насілля 8 было пад уплывам алкаголю. У той жа час выяўлена 6 выпіўшых вучняў гімназій і сярэдніх школ. Галоўнай прычынай такіх паводзін з'яўляецца мода на піцце піва і грамадская апрабацыя. Сярод дарослых залежных 20% складаюць жанчыны. Празмернае спажыццё алкаголю выклікае грамадскую дэградацыю яго спажыўцоў, так у сферы цялеснай (страваванне, нервы, кровазварот і трываласць пашкоджанне печані) як і псіхічнай. У моладзі, кранутай гэтай праблемай, выступаюць цялесныя і эмацыянальныя разлады, выкліканыя працяглым стрэсам. Празмернае спажыванне алкаголю і наркотыкаў прычыняецца да росту злачыннасці сярод нялетніх: і ліку віноўнікаў, і ліку ўчыненых імі злачынстваў.*

*Водазаборы і водаправоды ёсць ва ўсіх гмінах павета, але каналізацыю маюць толькі Бельск і Браньск ды гміны Боцькі і Рудка. Паказальнікі ачышчаных сцёкаў у павеце (44%) крыху ніжэйшыя за сярэднія ў ваяводстве (56%) і краіне (54,7%); гэтаксама справы маюцца ў гарадах (71% для Бельшчыны, 88,6% для ваяводства і 80,9% для краіны) і вёсках (8%, 9,6% і 12,4%).*

*На тэрыторыі Бельскага павета працуе толькі адна звалка камунальных адкідаў з засцерагальным субстратам — у Браньску. Апошнія звалкі не задавальняюць сучасных тэхналагічных патрабаванняў. Звалкі не прадбачаны і для прыёму небяспечных адкідаў, няма таксама вызначанага месца для вывазу і нейтралізацыі адкідаў з выратавальных мерапрыемстваў. Няма пастаяннай звалкі для прамысловых адкідаў.*

*У Бельскім павеце дзейнічае звыш 14 тысяч сельскіх гаспадарак, у якіх плошча ўгоддзяў большая за 1 гектар. Сярэдняя плошча гаспадарак — 9,81 га. На тэрыторыі павета наглядаецца хуткае старэнне жыхароў вёсак і міграцыю насельніцтва ў гарады. Уладальнікі гаспадарак, якім менш за 30 гадоў, складаюць 7,5% ад усіх, ад 31 да 40 гадоў — 17,7%, 41-60 гадоў — 39% і звыш 60 гадоў — 35,8%.*

**Міхал Мінцэвіч**

Вачыма еўрапейца

# З кантэкстам



*Усё дзіву даюся ад волі і адчаю, з якімі дзейнічаюць Анжаліка Борыс, Анджэй Пісальнік і іншыя дзеячы непрызнаванай Аляксандрам Лукашэнкам управы Саюза палякаў Беларусі. Незалежна ад пару дзесяткаў допытаў і іншага роду націскаў беларускіх улад, не паддаюцца яны і дамагаюцца захавання ўласнай тоеснасці і сувязей з Польшчай, з надзеяй на жыццё ў поўнасцю дэмакратычнай краіне, іхнай краіне, у якой нарадзіліся. Анжаліка Борыс была ў Польшчы нядаўна ў чарговы раз. Як прызналася журналістам, памежныя службы ў Беларусі пагразілі ёй, што больш яе не выпусцяць. Гэта ўпісваецца ў выказванні прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі, які ў час прэс-канферэнцыі ў Мінску заявіў, кіруючыся сабе толькі вядомай логікай:*

*— У Беларусі не пражываюць ніякія палякі. Ёсць тут толькі палякі па паходжанні. Гэта нашы беларусы, нашы грамадзяне.*

*Пры нагодзе. У гэтых выказваннях, быццам рэха, адгукнуліся ў маіх вушах падобныя заявы, выказваныя м.інш. у час дэбаты над законам аб нацыянальных меншасцях некаторымі польскімі дэпутатамі Сейма папярэдняга склікання, сярод іх сённяшняга неафіцыйнага кааліцыянта — Лігі польскіх сем'яў і яе падляшскага дэпутата Анджэя Фэдаровіча. Анжаліка Борыс, аднак, не адчувае сябе „ніякай полькай" і не толькі „нашай беларускай". Спрабавала гэта разам з Анджэем Пісальнікам у Варшаве растлумачыць спікеру Камісіі правой чалавека ААН Адрыяну Северыну. Высновы таксама і з гэтага спаткання маюць паслужыць адзначэнню першы раз пытання палякаў у Беларусі ў гадавым рапарце ААН аб правапарушэннях у свеце. У час сустрэчы з маршалкам Сейма Маркам Юркам Борыс пачула, што магчыма цяперашняму парламенту ўдасца ўрэшце ўстанавіць „Карту паляка". Як падалі прэс-агенцтвы, мела б яна спрасціць уезд у Польшчу і даць магчымасць стацца на працу землякам з-за ўсходняй мяжы. Ды што з таго, калі нявыгадным палякам з Беларусі (ды і не толькі беларусам польскага паходжання) беларуская ўлады адбіраюць пашпарты, як ужо здарылася і можа здарыцца хоць бы з Анжалікай Борыс.*

*З іншымі дэкларацыямі перад старшынёй СПБ выступіў прэм'ер Казімеж Марцінкевіч. Абяцаў ён заснаваць — як гэта назваў — установу, якая будзе займацца палякамі на Усходзе. Намеры слушныя. Толькі нашто стварaць новую структуру, калі ўжо ёсць да таго прызначаная Wspólnota Polska. Можа не павінна яна займацца толькі выпадковымі зборамі дараў, але пашырыць сваю дзейнасць, агульна кажучы: на дзеянні звязаныя з падтрымкай мараў аб усім тым, што звязана з панаццем дэмакратыі. Прытым, спасылаючыся на дэкларацыі маршалка Юрка і прэм'ера Марцінкевіча, нельга забывацца аб тым, што справа палякаў у Беларусі, сярод гэтага сітуацыя вакол СПБ, не можа, асабліва еўрапейцамі-палякамі — трактавацца ў адарванні ад праваапарушэнняў у Беларусі агулам, абмяжоўвання там усялякага роду свабод і правой грамадзян і да г.п. Наколькі ведаю, мары беларускіх асяроддзяў звязаныя з апазіцыйнымі коламі вельмі сходныя з імкненнямі СПБ Анжалікі Борыс. Так я і адчытаў намеры акцыі Amnesty International: „Так вось выглядае свабода слова ў Беларусі, якую кранулі дзве найбольшыя польскія штодзёнкі «Rzeczpospolita» і «Gazeta Wyborcza»". Разам з прыездам дзеячаў СПБ ацэнзуравалі яны свае першыя старонкі, замазваючы большасць тэкстаў. Значыць, думаю, справа палякаў у Беларусі не можа быць у Польшчы пазбаўлена ўсяго беларускага кантэксту. Іначай зробім шкоду непрызнаванаму СПБ, які будзе прадстаўляцца беларускай прапагандай з усімі яе сілавымі паслядоўнасцямі, як шавіністычна-нацыяналістычная група, у найгоршым тлумачэнні.*

**Мацей Халадоўскі**

# „Бязмежжу” дзесяць гадоў



Удзельнікі „Бязмежжа” на польска-беларускай мяжы ў вёсцы Апака

Як не парадаксальна, зблізіла нас мяжа, кажа Барыс Пятровіч Сачанка, празаік і віцэ-старшыня рэпрэсаванага Саюза беларускіх пісьменнікаў, ад трох гадоў удзельнік літаратурна-мастацкіх семінараў, арганізаваных Беларускім саюзам у Рэчы Паспалітай.

Сёлетняе, ужо дзесятае, „Бязмежжа” пачалося менавіта з экскурсіі ў Апаку што ля Чаромхі, вёску, якую пасярэдзіне перасякла савецка-польская мяжа. На старым месцы захаваўся адно „польскі” бок Апакі, ужо абязлюдзелай і састарэлай. Савецкая частка перакінутая за пяць кіламетраў ад кардона (яе нельга пабачыць з-за лесу, тут Белавежская пушча). Паўз граніцу пазначанай жалезным плотам, па тутэйшым баку, пракладзены веласіпедны шлях для турыстаў. Знакі еўрачасу не натхняюць тут аптымізмам. У канцы Апакі ўказальнік паказвае кірунак на „Wysypisko śmieci”. На момант спынімся ў старой школе. Вокны, праз якія віднее лес, забітыя жалезнай кратай.

Далей завітаем у недалёкую Бобінку, слаўную з-за падзеі 1961 года, калі стыхійна зламаўся на чатыры дні жалезны кардон і сустрэліся раскінутыя на два бакі сем'і. Падзеі невядомыя свету захаваліся ва ўспамінах старажылаў. Яны натхнілі Міхася Андрасюка, празаіка родам з недалёкай Войнаўкі. У апавяданні „Сталін” рассакрэчаны падзел згаданай Апакі. Аказваецца, частка вяскоўцаў апынулася на польскім баку дзякуючы самагонцы, салу і пукатай бочцы мёду, на якія палакоміліся савецкія заваёўшчыкі. Кніжка Міхася Андрасюка выйдзе ў 2006 годзе.

* * *

Далейшая частка двухдзённага літаратурна-мастацкага семінара праходзіла ў Гайнаўцы 26 і 27 лістапада. Хоць у асноўным разглядаліся праблемы сучаснай літаратуры і яе прэзэнтацыі, былі адзначаны дасягненні апошніх дзесяці гадоў:

— Нам удалося знайсці вартасныя творы і паказаць іх у польскай літаратуры, — гаварыў ініцыятар і арганізатар сустрэч Яўген Вапа. У выніку „Бязмежжа” выйшла чатырнаццаць кніжак. Гэта польскія пераклады Быкава, Арлова, Разанава, Глёбуса. Гэта „Анталогія сучаснай беларускай паэзіі”. Гэта беларускія кніжкі такіх аўтараў як Глёбус, Гумянюк, Астраўцоў. Гэта публікацыі беларускіх аўтараў на старонках беластоцка-польскага часопіса „Карткі” і літаратурна-мастацкага часопіса „Правінцыя”...

— Мы наладзілі трывалае сяброўства з беларускім літаратурным асяроддзем ды можам сачыць за актуальнымі працэсамі і з'явамі, можам уплываць на іх развіццё, — гаварыў Яўген Вапа.



Мінск: Анатоль Івашчанка, Барыс Пятровіч, Зміцер Вішнёў



Польшча: Богдан Бялэк, Юры Плютовіч, Надзея Артымовіч

— Сапраўды, цяжка сёння ўявіць літаратурны працэс без падтрымкі Беласточчыны і „Бязмежжа”, — пагаджаецца Барыс Пятровіч Сачанка. „Бязмежжа” — падобна як „Басовішча” — гэта стымул для развіцця, праектаў. Падтрымка і ў маральным плане.

У новы пралукашэнкаўскі Саюз пісьменнікаў Беларусі, які быў створаны каб даканаць Саюз беларускіх пісьменнікаў, паступілі рускамоўныя апаратчыкі. Ад рэжымнай арганізацыі адмовіліся ўсе народныя пісьменнікі, у тым ліку беларускасавецкія класікі як Іван Мележ і Іван Навуменка.

— Уся гэтая арганізацыя будуецца на хлусні, — кажа Барыс Пятровіч (пісьменніка, разам з сябрамі СБП, рэжымнікі прагналі са свайго сходу). Выступленне рэдактара „Дзеяслова” навеяла прыгнятальна чорны настрой, асабліва сярод гасцей з польскага боку, якія ў сваю чаргу наракалі на блакаду інфармацыі з Беларусі. Сярод змрочнай сітуацыі ёсць перспектыўныя з'явы. У 19 нумары „Дзеяслова” дэбютуюць 23 маладыя літаратары.

Нараджаецца таксама камерцыйны рынак для беларускай літаратуры. Выдавецтва „Логвінаў” на працягу трох апошніх гадоў выдала за 80 беларускіх аўтараў. Апрача прозы выдаецца паэзія, літаратурная крытыка, драматычныя творы. Як адзначыў звязаны з выдавецтвам паэт, літаратурны крытык і празаік Зміцер Вішнёў, кніжкі пакуль разыходзяцца ў Мінску.

Богдан Бялэк — галоўны рэдактар часопіса „Характары” з Кельцаў, гаварыў пра сітуацыю выдавецкага рынку ў Польшчы. „Характары” дасягнулі самы высокі тыраж сярод літаратурных часопісаў у краіне — 47 тысяч. Поспех у спалучэнні двух жанраў. У асноўным часопіс прысвечаны псіхалогіі, а літаратурныя творы выступаюць як дадатак.

— Наш чытач гэта ў 80 працэнтах жанчына — адзначыў Богдан Бялэк.

Пра выдавецкі рынак у Польшчы дакладваў таксама Пётр Брысач, звязаны з беластоцкімі „Карткамі”.

* * *

Як кожны год, стрыжнем семінара сталіся літаратурныя чытанні і мастацкія выступленні ўдзельнікаў. З падборкай новых вершаў выступілі Надзея Артымовіч, Міра Лукша, Юрый Плютовіч, Юрый Гумянюк, Яўген Вапа, Анатоль Івашчанка, Юрый Буйнюк. Вечарыну ўзбагацілі выступленні культавых бардаў — Касі Камоцкай і Зміцера Бартосіка, якія прэзентавалі прозу са зборніка „Чорны пісталет”.

— Самым вялікім дасягненнем, — падводзіць дзесяць гадоў Яўген Вапа, — лічу тое што пішацца вартасная літаратура.

**Тэкст і фота Ганны Кандрацюк**

## Сказалі пра „Бязмежжа”

**Алег Латышонак** — гісторык, перакладчык, пастаянны ўдзельнік „Бязмежжа”: — Самым вялікім поспехам лічу эфектыўныя пераклады, хоць, з другога боку, круг чытачоў у нас абмежаваны, бо кніжны рынак вызначаюць прэстыжныя выдавецтвы, да якіх у нас няма доступу. З другога боку, у Польшчы мала цікавяцца тым, што дзеецца на Усходзе. Калі пытаю сваіх студэнтаў хто з іх быў у Беларусі, аказваецца, ніхто не быў за ўсходняй мяжой.

**Юры Плютовіч:** — польскі паэт, эсэіст, аўтар сямі тамоў паэзіі: — Узровень семінараў высокі. Можа варта падумаць, каб польскі бок быў больш актыўны. Можа, арганізаваць „Бязмежжа” ў розных месцах — у Бельску, у Беластоку, у Варшаве, або ў Беларусі?

**Барыс Пятровіч Сачанка** — празаік, рэдактар „Дзеяслова”, намеснік старшыні Саюза беларускіх пісьменнікаў: — Дзякуючы „Бязмежжам”, мы пазнаёміліся з нашых чытачоў з беластоцкімі аўтарамі такімі як Міра Лукша, Ян Чыквін, Міхась Андрасюк. Рыхтуецца падборка твораў Надзеі Артымовіч і Яўгена Вапы.

**Міра Лукша** — паэт, празаік, журналіст: — „Бязмежжы” натхняюць да новых дарог, выбараў, асэнсаванняў. Зараджаюць пазітыўнай энергіяй. Такія сустрэчы чакаюцца цэлы год.

(гака)

## Прыгранічны гандаль

Чаромхаўская гміна карыстаецца двума пагранічнымі пераходамі: чыгуначным Чаромха — Высока-Літоўск і дарожным Полаўцы — Пяшчатка. Гэты апошні адно за дзевяць месяцаў (да 30 верасня) перасяклі: 264 988 аўтамабіляў, 352 881 грамадзянін Рэспублікі Беларусь і 59 181 паляк. У параўнанні да мінулага года складае гэта на 29% больш аўтамабіляў, 12,9% грамадзян РБ і 136% (!) палякаў. Няцяжка здагадацца, чым кіраваліся палякі выязджаючыя за ўсходнюю мяжу. Зразумела, што гандлем. Таннейшае паліва (бензін і салярка) ды гарэлка і папяросы давалі нядрэнны прыбытак. Гэта неадноўчы асноўная крыніца даходу беспрацоўных, як і павелічэнне дамашняга бюджэту пенсіянераў і інвалідаў. Працвітае прыгранічны гандаль. Палякі, як і беларусы, змагаюцца за кліента. Суседзям з-за мяжы лягчэй прыходзіцца, паколькі танней прадаюць свой тавар. Паліва, напрыклад, здаюць оптам на 50 грошаў танней за літр, а гарэлку ды папяросы — на 3 зл. (а нават больш) на адным блоку сігарэтаў ці літровай бутэльцы гарэлкі. Трэба адзначыць, што для беларусаў гэта нядрэнны бізнес, паколькі ў суткі могуць яны двойчы перасячы мяжу, зарабіўшы на адным курсе больш ста злотых (30-40 долараў). А ездзяць штодзень, карыстаючыся знаёмствамі з пагранічнікамі. Іх прапускаюць без чаргі. Не ўсіх, разумеецца, толькі выбраных. А мясцовыя „мурашкі" вымушаны ездзіць у адлеглы Сямятыцкі ці Бельскі паветы, каб там прадаць паліва. Іх тавар даражэй цэніцца, паколькі ён якасна лепшы, бо не махлююць. Амаль у кожнага беларуса салярка „хрышчаная", значыць, з дадаткам пячнога паліва. Хопіць паглядзець на від саляркі. Шафёр разбіраецца ў гэтым дасканала, але не звяртае ўвагу, паколькі танней купляе. З гарэлкай справа падобная. Купляеш, здаецца, манапольку, а п'еш „жывую спірцягу". У адным трэба разбірацца, ад каго купляеш. Суседзі з-за мяжы не падводзяць сталых кліентаў. Прадаюць добрую гарэлку. Не тое, што на рынку. Пераканаўся я асабіста. У народзе кажуць: „Танную юшку сабацы пад хвост выліваюць". Варта аб гэтым памятаць, даражэнькія, калі будзем штосьці купляць ад суседзяў з-за ўсходняй мяжы.

**Кастусь Млынарскі**

## У Гайнаўцы

Вуліца Баторыя ў Гайнаўцы — адна з важнейшых. З ёю спалучаецца восем іншых гарадскіх вуліц. Па ёй едуць з Беластока ў Белавежу. Яна з'яўляецца павятовай дарогай.

Сёлета па гэтай вуліцы пабудавалі водасцёкавую каналізацыю. У наступным годзе будуць ставіць святлафор на скрыжаванні вуліцы Баторыя з Ліпавай ды мост цераз рачулку Лясную. Па вуліцы Баторыя пракладуць новыя гранітныя бардзюры, асфальт. Прадбачваюцца таксама газоны. **(мох)**

*Мы не павінны саромецца таго, што мы — беларусы. Гэта дадатковы козыр, які павінен зрабіць больш цікавымі нашы мерапрыемствы і прыцягнуць людзей звонку...*

# Спадчына і інвестыцыі



Фота Аляксея Мароза

*— Хаця сельскагаспадарчыя падаткі моцна панізяцца, будзем надалей рэалізаваць у гміне інвестыцыі і праводзіць рамонты, — гаворыць войт Юрый Васілюк*

**У Чыжоўскай гміне ладзіцца многа беларускіх мерапрыемстваў. Калектывы „Чыжавяне", „Незабудкі" і „Збучанкі" — амбасадары гміны на беларускіх мерапрыемствах павятовага і ваяводскага ўзроўняў. Гурт „Чыжавяне", як прадстаўнік беларусаў у Польшчы, выступаў у час дзяржаўных дажынак. Войт Чыжоўскай гміны Юрый Васілюк разлічвае на вяртанне да сваёй гісторыі, культуры і традыцый. Не забывае ён пра гаспадарчыя справы і паспяхова, разам з працаўнікамі, хадайнічае за еўрасаюзныя сродкі на гмінныя інвестыцыі. Зараз у Чыжах будуецца ачышчальня сцёкаў і адрэзак каналізацыі.**

### З фальклорам і гісторыяй

20 лістапада жыхары Чыжоўскай гміны і госці сабраліся ў вялікай вясковай святліцы ў Чыжах, каб паслухаць беларускіх песень. XIII Асеннія сустрэчы з фальклорам адкрыў войт Юрый Васілюк. Перад публікай з фальклорнымі песнямі выступілі калектывы з Чыжоў, Курашава і Збуча. Апрацаваныя песні спявалі вучні мясцовага школьнага калектыву „Праменьчыкі", гарцэрскага калектыву „Лясная гавэнда", а моладзь з „Перапёлкі", што дзейнічае пры Гайнаўскім доме культуры, танцавала. Калектыў „Малінкі" з Маліннік займальна паказаў абрад „Пакудзелле". Перад фальклорным спатканнем працаўнікі Касы сельскагаспадарчага сацыяльнага страхавання з Гайнаўкі сустрэліся з сялянамі і падвялі вынікі конкурсу „Самастойная праграма ў карысць паляпшэння бяспечнасці працы ў гаспадарках", які праводзіўся на тэрыторыі Чыжоўскай гміны. Пераможцам стаў Аляксей Янчук з Курашава, які ў найбольшай ступені ўдасканаліў бяспечнасць працы ў сваёй гаспадарцы і трымае ў ёй парадак.

У Чыжоўскай гміне пастаянна ладзіцца беларускія дажынкі, ад некалькіх гадоў — археалагічны фэст і народнае гулянне „Купалінка", якія сталі масавымі мерапрыемствамі. Войт Юрый Васілюк моцна ангажаваўся ў разметку на тэрыторыі ягонай гміны Царскага шляху. Зараз у Чыжах, Збучы і Койлах устаноўлены стэнды з інфармацыяй пра гісторыю мясцовасцей на беларускай мове.

— Мы не павінны саромецца таго, што мы — беларусы. Гэта дадатковы козыр, які павінен зрабіць больш цікавымі нашы мерапрыемствы і прыцягнуць людзей звонку. Нельга забывацца аб сваіх каранях. Памылкай было б, калі б мы не хацелі размаўляць аб сваёй спадчыне, — кажа войт Юрый Васілюк. — Прымалі мы ўдзел у рэстаўрацыі Царскага шляху, хочам паказаць іншыя мясцовыя атракцыёны, каб прыцягнуць турыстаў. У бліжэйшай будучыні плануем у Чыжоўскай гміне намеціць адукацыйную археалагічную сцежку.

### Пракладка каналізацыі

У Чыжоўскай гміне асаблівая ўвага адводзіцца гаспадарчым справам. У ліпені гэтага года побач Чыжоў распачалася будова ачышчальні сцёкаў. Плануецца, што яе будова разам з выкананнем каналізацыйнага канала даўжынёй 1 144 метры, будзе каштаваць 1 мільён 440 тысяч злотых. Ажно 75% сродкаў ад кваліфікаваных коштаў інвестыцыі (размерам 1 мільён 371 тысяча) будуць перададзены Еўрапейскім фондам рэгіянальнага развіцця, 10% сродкаў складзе падтрымка дзяржаўнага бюджэту і толькі 15% коштаў будзе дафінансаваных з гміннага бюджэту. Узведзены ўжо шматфункцыянальны будынак, такі ж рэактар і частка дадатковага ўспамагальнага абсталявання, што складае больш за палову інвестыцыі. Прадбачваецца, што будзе яна завершана ў чэрвені 2006 года.

— Сабіраючы ўласныя сродкі, пакарысталіся мы крэдытам з Ваяводскага фонду аховы асяроддзя. Калі мы дастасуемся да іх патрабаванняў, то 25% гэтага крэдыту даруюць нам, — інфармуе войт Васілюк. — Гатовая ўжо дакументацыя на будову каналізацыі ва ўсіх Чыжах і будзем хадайнічаць за еўрасаюзныя сродкі на яе будову ў 2007 годзе, а ў наступных гадах будзем думаць аб каналізацыі ў іншых вёсках.

— Многія жыхары Чыжоў дапытваюцца, калі ў вёсцы будзе зроблена каналізацыя, бо хочуць да яе падключыцца. Многа добрага зрабілася апошнім часам у гміне. Наш войт малады хлопец, але геройскі і гаспадарны, — кажа чыжоўскі солтыс Андрэй Ціханюк.

### Мадэрнізацыя дарог

Восенню завяршылася будова павятовай асфальтавай дарогі Курашава — Ляды, даўжынёй 2 900 метраў, якая часткова была дафінансаваная з гміннага бюджэту. У гэтым годзе была асфальтаваная вуліца ў Ляневе, якая з'яўляецца гміннай дарогай. З гміннага бюджэту будзе дафінансаваны рамонт павятовай дарогі Чыжы — Ракавічы і будзе выконваца дакументацыя на рамонт дарог Кленікі — Гукавічы і Чыжы — Ляды. За гмінныя сродкі былі праведзены рамонты кухняў у Комплексе школ у Чыжах і яго філіяльнай школе ў Кленіках, рамантавалася лесвіца перад уваходам у чыжоўскую школу і частка агароджы. У 2006 годзе будуць рамантавацца школьныя ванныя і туалеты.

— Дзяржаўнай субвенцыі на школьныя выдаткі не хапае. У гэтым годзе, апрача выдаткаў на ацяпленне школ, давоз дзяцей і рамонтныя інвестыцыі, даложым з гміннага бюджэту ажно 336 тысяч злотых, — заяўляе Юрый Васілюк.

У гэтым годзе ва ўсіх вёсках былі мадэрнізаваны найважнейшыя адрэзкі палявых дарог, на якія навезлі гравію. Адрамантавалі святліцу ў Камені, у чарзе чакае святліца ў Койлах. У будучыні прадбачваецца рамонт святліцы ў Моры. Ужо ўпарадкавалі тэрыторыю вакол вадаёмаў у Ляневе і Лядах. Плануецца ачысціць ад мулу рэчку Локніцу каля Курашава.

— Сёлета распачалі мы мадэрнізаваць будынак Добраахвотнай пажарнай каманды ў Чыжах. На гэтую інвестыцыю атрымалі мы сродкі з Галоўнай і Ваяводскай упраў Пажарнай аховы, — інфармуе войт Юрый Васілюк. — Купілі мы абсталяванне для тушэння пажару для каманд у Вульцы і Лядах.

### Паставілі на раслінаводства

У Чыжоўскай гміны сельскагаспадарчы характар. Тут адны з самых лепшых у Падляшскім ваяводстве зямель. Гаспадары ставяць націск, у галоўным, на раслінаводства. Апошнім часам малодшыя гаспадары пабольшылі вытворчасць малака. Самымі вялікімі пастаўшчыкамі збожжа з'яўляюцца Яўген Заброцкі са Збуча, Ян Адамчук, Яўген Астапчук і Яўген Андраюк з Чыжоў, а самым вялікім пастаўшчыком малака з'яўляецца Міхал Кобаць з Кленікаў.

— У гэтым годзе цэны на збожжа слабыя і таму даход сялян у нашай гміне невялікі. Калі за цэнтнер жыта плацяць 26 злотых, за цэнтнер пшаніцы па 35-38 злотых, а за цэнтнер угнаення трэба заплаціць 86 злотых, то аб якой прыбытковасці можна тут гаварыць. Людзі ў нас жывуць, у асноўным, на грошы ад продажу малака і з пенсій, калі ў сем'ях ёсць старэйшыя асобы. Добра плаціў работнікам Васіль Дамброўскі, але апошнім часам абмежавалася ў яго прадукцыя, — гаворыць Андрэй Ціханюк.

**Аляксей Мароз**

*Быў пункт прыёму малака, былі сіласы. Была пошта, быў пастарунак, была школа, была гміна. А цяпер таго ўсяго няма...*

# Вёска Снежкі з гміны „Б”

**У Снежках, што ў Боцькаўскай гміне, рана на вуліцы ціха. Па бруку відаць, што ціха тут заўсёды. Заходжу ў солтысаву хату, жыве тут двое пажылых людзей. Спачатку ставяцца да мяне як да звычайнага няпрошанага госця. Бо жыццё стала цяпер такое, што ўжо нічога добрага нельга спадзявацца, асабліва ж калі ў хату завітае нехта новы, мо з нейкай навіной, а навіны і ў наш агульны час, і ў іх пастарэлы час — наогул невясёлыя.**



Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

Калісь Снежкі былі важнай вёскай. Быў пункт прыёму малака, былі сіласы. Была пошта, быў пастарунак, была школа, была гміна. А цяпер таго ўсяго няма...

Бо калісь у Снежках было многа маладых людзей. Бо і вёска была людная — па тры сям'і ў адной хаце жылі. Ад таго калісь да сёння многія павыязджалі ў свет, а цяпер асталіся амаль адны старыя. Амаль усе былі калісь ездзілі на працу ў пэгэеры, але і амаль усе яны вярнуліся адтуль. На наш час асталося многа адзінокіх, асабліва жанчын, найбольш пасля шасцідзесяці. Мае гаспадары-субяседнікі падлічылі, што з аднаго боку вуліцы жыве сорак шэсць душ і з другога — трыццаць. Некалькі асоб прыязджае на лета, а на зіму вяртаюцца да дзяцей у Бельск. Двое дзяцей са Снежак вучыцца ў сярэдніх школах у Бельску, пяцёра ў гімназіі і падставоўцы ў Боцьках і двое дашкольнага ўзросту.

Гаспадарыць ужо нямнога людзей. Толькі адна маладая ўдава, што жыве на калёніі, якой муж нядаўна загінуў на машыне каля Нурца, трымае шмат кароў і да яе па малако прыязджае цыстэрна аж з Вэнграва. Чатыры сям'і атрымліваюць еўрасаюзную пенсію. Адзін з такіх гаспадароў трымае восем ці дзевяць кароў, але зямля апісаная на дачку, што ў Бельску жыве. І яшчэ адзін мае пяць кароў. І яшчэ адзін хлопец, што астаўся сам з мацерай, гаспадарыць. І яшчэ адзін, з бацькамі. І яшчэ адзін мужчына пасля трыццаткі, які толькі што запісаўся. Да вясны мінулага года быў у Снежках пункт прыёму малака, а цяпер шасцёра гаспадароў возяць малако ў такі ж пункт у Малочках. У двух гаспадароў коні, адзін з іх не мае нават трактара.

Да гаспадара ўваходзяць двое мужчын, дамаўляюцца пра вывазку дроў. Пасля іх адыходу даведваюся, што маладыя сосны ўсыхаюць ад нястачы грунтавой вады і паслужаць апалам на зіму. Людзі паляць у печах дровамі, а чацвёра гаспадароў мае ў сваіх хатах цэнтральнае ацяпленне.

Водаправод праклалі ў Сасіны год таму. Калісь у суседніх Сасінах пры камуне былі выбілі студню і стаіць яна нявыкарыстаная. Тлумачылі вяскоўцам, што ставіць там новы гідрафор абыдзецца даражэй, чым давесці ваду з Дубяжына. І працягнулі водаправод з Дубяжына ў Нурэц, з Нурца ў Малочкі і спыніліся. Солтыс нават з войтам перагаварыўся, а той адгрызся, што ў Снежках камуністы. І павялі водаправод з Нурца ў Быстрае, з Быстрага ў Сасіны і толькі з Сасін у Снежкі.

Цікаўлюся яшчэ, як пажылыя людзі карыстаюцца медыцынскімі паслугамі. Даведваюся, што некалькіх жыхароў Снежак іхнія дзеці, што жывуць у Бельску, запісалі ў бельскія амбулаторыі і калі трэба, прыязджаюць на машынах і забіраюць у Бельск. А ўсе апошнія запісаны ў Боцькі. У выпадку неабходнасці хворыя выклікаюць скорую дапамогу.

Далей пайшоў я глядзець вёску сам. У Снежках працуе яшчэ сталая крама, у якой, так як і ў іншых вясковых крамах, дзяжурыць крыху мужчын. Калі пакажацца хто чужы, прыціхаюць, каб пасля зноў усё грунтоўна абгаварыць і растлумачыць пра тое, што ўбачылі ў тэлевізары.

іншых удзельнікаў улады і іншыя яе абумоўленасці, align разнагалоссе буйнее і жанчына рэцірующа дахаты.

Са Снежак выходжу на загуменне, дзе былыя калгасныя збудаванні. Здалёк відаць, што былая абора занята толькі рэфлексіяй над непазбежным праміннаннем. У былым свінарніку, што каля дарогі ў поле, асталося крыху карыт, з берагоў падгнівае скляпенне. Дарога, якой кіруюся ў Бялкі, з абодвух бакоў насаджана маладым ляском: сасняком і бярэзінай; трыццаць, а мо нават і дваццаць гадоў таму расло там жыта з блакітнымі васількамі або бульба з чырвонымі лічынкамі каларадскага жука.

Перад Бялкамі даганяае мяне солтыс Снежак, спыняе трактар. За час, калі я выйшаў з ягонай хаты, ён крышку разбудзіўся, крышку ўсвя-



Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

Іду на канец вёскі і калі вяртаюся, адзін з мужчын, які сачыў за маёй цікавасцю вёскі, цікавіцца, чаго і я высочваю. Да размовы падключаецца жанчына, радая, што можа панаракаць на цяперашняе запушчэнне сваёй вёскі. Але той мужчына рэзка перасякае яе спробу сыграць трагічны маналог, упікаючы проста ў вочы, што калі была раднай, дык толькі камандзіровачныя брала, а для вёскі нічога не зрабіла. Нягледзячы на маю спробу залагодзіць канфлікт і скіраваць адказнасць за невясёлую рэчаіснасць на

доміў, што я не з'явіўся з мэтай нейкага прапаведавання ці іншага абдурвання. І загаварыў больш шчыра. Калі ў Боцьках быў ранейшы войт, які быў звонку, недзе з Люблінскага, ён быў справядлівы да ўсіх. А калі настаў цяперашні, з Боцькаў, то ён спіхае вёскі з паўднёва-ўсходняй часткі гміны на далейшы план. Бо гэтыя вёскі галасавалі за Цімашэвіча. Міжваенны падзел на лепшую і горшую часткі Польшчы астаецца ў Боцькаўскай гміне беражна ахоўваемай традыцыяй.

**Аляксандр Вярбіцкі**

*22 лістапада 2005 года на 93 годзе жыцця памёр **ВАСІЛЬ ФІЛІМАНЮК** з вёскі Мора. Сям'і Нябожчыка словы шчырага спачування з прычыны напаткаўшага іх гора выказваюць Віктар, Валянціна і Наталля Швед.*

## Турызм у Белавежскай гміне

— 2 —

Белавежскую пушчу перасякае сем пешых турпраходаў:

— Белавежа — Тапіла;

— Белавежа — Чарлёнка — Звярынец;

— Месцы народнай памяці (вакол Белавежы);

— Белавежа — Семяноўка;

— Белавежа — Нараўка;

— Месца моцы — колішні цэнтр славянскага язычаскага культу.

Ёсць два веласіпедныя маршруты: Падляшскі бусліны шлях на адрэзку Белавежа — Нараўка і Белавежа — Тапіла. Апрача гэтага вызначаны шэсць трас для верхавой язды, брычак і санак.

У Белавежы працуюць тры адукацыйныя ўстановы (Цэнтр прыродазнаўчай адукацыі, Музейнаадукацыйны цэнтр і Цэнтр лясной адукацыі) і размечаны сем адукацыйных дарожак. Ёсць шэсць пунктаў пракату веласіпедаў. Турыстам прапануюцца таксама верхавыя коні, прагулкі брычкамі, санямі, табарным возам, стылізаваным на вузкакалейку „Белавежскім экспрэсам” і акумулятарным вазком.

Начлежная база канцэнтруецца ў Белавежы: тры гатэлі (разам 365 месц), Паляўнічы дом БНП (32), „Іва” БНП (105), тры пансіянаты (122), турысцкі дом ПТТК (60), клуглагадовая маладзёжная турбаза (50), два кемпінгі і 29 агратурыстычных кватэр — у Белавежы (23), Тэрэміскіх (5) і Пагарэльцах (1); усяго каля тысячы начлежных месц. Працуюць рэстараны, пункты малой гастраноміі, вызначаны месцы пад вогнішчы.

З назіральнай вышкі музея БНП можна глядзець наваколле Белавежы. Нядаўна быў адкрыты пешавеласіпедны пагранпераход у беларускую частку пушчы. У Белавежы дзейнічае пяць пунктаў турыстычнай інфармацыі і працуе дзесяць турыстычных бюро.

**Міхал Мінцэвіч**

## Дзюдо

Дваццаць гадоў актыўна дзейнічае клуб дзюдо ў Гайнаўцы. Ад самага пачатку вядзе яго Якуб Астапчук. Нядаўна ў сувязі з юбілеем была знакамітая нагода для сустрэчы ды ўспамінаў былых і цяперашніх дзюдаістаў.

Цяпер у Гайнаўцы ёсць добрыя ўмовы для ўсіх, хто хоча займацца спортам, а перш-наперш дзюдо. Клуб дзюдо мае ўласны зал для практыкаванняў, трэнажорны зал, сауну. Усё гэта дзякуючы між іншым былой бурмістр Гайнаўкі Ядвізе Рудзінскай-Патэюк. Зараз прыходзіць сюды трэніравацца 100 асоб, у тым ліку 25 дзяўчат.

Гайнаўскі клуб дзюдо вядомы не толькі ў Падляшскім ваяводстве. Ён мае немалыя дасягненні. У 2003 годзе Кацярына Габрышук была найлепшай у спаборніцтве на першынство Польшчы. Зараз трэцяе месца ў нашай краіне займае Павел Татарыновіч, пятае — Кароль Козак і сёмае месца — Рафал Сасноўскі. Ёсць шмат юных перспектыўных дзюдаістаў. На трэніроўкі пачалі прыходзіць дзеці ва ўзросце 6 і 7 гадоў. **(мох)**

зорка
для дзяцей і моладзі



Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

## *Матэматыка па-беларуску*

**— 2 —**

Каментар на гэту тэму працягваюць гімназісты І „д” класа бельскай „тройкі” (пачатак у „Зорцы” № 48):

**Ігар Верамяюк**: — Я думаю, што ўрок матэматыкі па-беларуску быў бы зразумелы, мы ж ведаем беларускую мову.

**Сільвія Наталля Плуг**: — Я вельмі люблю вучыцца беларускай мове. Думаю, што матэматыка па-беларуску гэта вельмі добрая задума. Мы будзем лічыць, дадаваць і адымаць толькі па-беларуску. Наша школа беларуская, таму і матэматыку можна выкладаць на гэтай мове. Аднак, каб не зачаста.

**Марцін Ткачук**: — На мой погляд, гэта недарэчная прапанова. Я слабавата ведаю беларускую мову і напэўна ў мяне былі б праблемы зразумець тое, што гаворыць настаўнік. Найлепш нічога не мяняць.

**Шымак Хмур**: — Я думаю, што не будзе лёгка, таму што мы слабенька ведаем беларускую мову... і матэматыку таксама. Але з другога боку, мне цікава даведацца, як на беларускай мове гучаць матэматычныя тэрміны і формулы.

**Зорка**

**Рыгор Барадулін**

### *Загадкі на градках*

*З вусамі,*
*А не стары.*
*Зайздросныя вочы.*
*За што-небудзь на двары*
*Учапіцца хоча.*
*Хопіць хітрасці на трох,*
*Ну на тое ён...*

(Гарох)



# Экскурсія ў Новае Беразова

У 8.30 перад школу заехаў аўтобус і мы занялі месцы. Разам з намі паехалі настаўніцы Бажэна Ляўчук і Іаланта Грыгарук.

Да Новага Беразова з Гайнаўкі недалёка, каля 7 кіламетраў. У час падарожжа мы глядзелі асенні краявід за вокнамі і размаўлялі між сабою, а некаторыя вучні нават спявалі. Некалькі хвілін пасля дзевятай гадзіны мы былі ўжо на месцы. Спыніліся перад дзвюма пабеленымі хатамі. Спачатку мы пайшлі паглядзець страусаў. Было там многа агароджаў, у якіх хадзілі страусы — і малыя, і дарослыя. Пан Чабай расказаў нам аб сваёй працы, аб страусах, што яны ядуць, дзе іх трымае зімой і многа вельмі цікавых рэчаў. Мы цікавіліся ўсім і ставілі пану Чабаю шмат пытанняў, на якія ён вельмі ахвотна адказваў.

Пасля пан Чабай завёў нас у аднаўленую хату. Была гэта хата з 1853 года. Наведалі мы таксама і другую хату. Абедзве хаты драўляныя, нізкія, крытыя саломай. Пан Чабай паказаў нам як выглядае хата ўсярэдзіне і расказаў аб жыцці і працы колішніх людзей. У сярэдзіне адной хаты былі два памяшканні: сенцы і пакой. У пакоі стаяў адзін шырокі ложак, стол, лава і сундук. Да столі была замацавана калыска, так каб адначасна і працаваць, і займацца дзіцяткам. У хаце было многа прадметаў штодзённага побыту. У другой хаце была вялікая гліняная печ. Гэтая хата лепш аснашчаная, бо ў ёй ёсць праточная вада і тэлевізар. Пан Чабай абнавіў гэтую хату, каб наймаць яе турыстам.

Пасля чакаў нас чарговы атракцыён — вогнішча. Мы селі вакол кастра, пяклі каўбаскі і весела размаўлялі. Аднак прыйшла пара вяртання. У аўтобусе было вельмі шумна, бо мы дзяліліся ўражаннямі ад экскурсіі. Пасля прыезду ў Гайнаўку ўсе хутка разбегліся па хатах. Гэта быў цудоўны дзень!

А ўсё гэта адбылося ў сераду, 2 лістапада г.г. У экскурсіі ўдзельнічаў І „ц” клас (гуманітарны) Гайнаўскага белліцэя.

**Рыгор Плева (Гайнаўка)**

## *Гражынка і Грак*

**— 3 —**

Грак сядзеў на падваконніку і глядзеў у акно. Фортачку забыліся зачыніць яшчэ зранку. На дварэ дзьмуў халодны вецер, заслабы, каб падняць мокрае, апалае, парудзелае лісце, але пранізлівы, халодны. Грак глядзеў на птушак, якія лягалі паміж дрэвамі, скакалі па мураве, хадзілі па зямлі, шукаючы паесці. Грак азірнуўся — на ягонай табурэтцы стаяла місачка з зернем і крышынкамі варанага яйка, місачка з вадой, ляжаў кавалак хлеба. Нават есці адхацелася, жывот поўны... Вецер на вуліцы раздуваў пёры птахаў — варон, галак, вераб’ёў ды галубоў, ставіў іх старчма, запыняў на паўдарозе да рэдкай здабычы...

— Ну, ляці ж, — з-за шыбы азваўся шэры кот спадар Шадар. Шадар жыў у суседзяў і з Граком бачыліся яны толькі праз шыбу.

— А ты мяне не зловіш?

— Усіх вас не пераловіш! — пасміхнуўся пад вусом Шадар. — А так хоць паразмаўлялі б. З імі не пагаворыш, уцякаюць, маюць свой занятак. А ты хоць на волі пабыў бы. Вернешся праз фортку. А, можа, я да цябе ўскараскаюся?

Кінуў Грак вокам на гадзіннік: неўзабаве прыедзе са школы Гражынка... Халадна!.. Дык хоць няхай спадар Шадар зойдзе... Вылятаць не хочацца ў такую зябу на волю...

— Для кампаніі цыган даў сябе павесіць! — махнуў дзюбай Грак. — Ускоквай! Ды я прапаную толькі талковую размову. І пачастунак. Так паміж намі гракамі ды катамі. Размова на дыпламатычным узроўні, га?

Спадар Шадар узлез на бярозу, дробным крокам па доўгай галіне, што блізка звісала да акна, ссунуўся да фортачкі і ўслізнуўся ў хату. Пац! — зваліўся на падваконнік побач Грака.

— Ну, як? Спрытны ты, Шадар.

— А яшчэ буду спрытнейшы! — ашчэрыў свае снежна-белыя зубы кот. — Вось ты, як добры дурань, упусціў мяне дахаты! Няма сантыментаў у палітыцы!

Грак ледзь выбраўся з-пад каша кіпцюроў. У гэты момант адчыніліся дзверы. Гэта вярнулася са школы Гражынка.

— Адкуль тут у нас спадар Шадар апынуўся?

— У госці прыйшоў! — дыпламатычна аддыхнуўся Грак.

**Міра Лукша**

# *Вершы Віктара Шведа*

## *Спадчыннасць*

*Настаўніца дзяцей пытае:*
*— Што спадчыннасцю называем?*
*У класе цішыня адразу,*
*Ніхто не ведае адказу.*

*Азвалася раптоўна Рая:*
*— Па-мойму спадчыннасць мы маем,*
*Калі атрымаў двойку Жэня*
*За свайго бацькі сачыненне.*

# Даганяюць

Агнешка Майстровіч, Эля і Кася Супрунюк „новыя” ў бельскай „тройцы”. Дзяўчаты раней не вучыліся беларускай мове. Зараз, як адзначае настаўніца, яны першыя энтузіясткі ў класе.

— Звычайна мы ладзім пазаўрочныя заняткі для пачаткоўцаў, — адзначае Валянціна Бабулевіч.

Агнешка, Эля і Кася не хадзілі на дадатковыя ўрокі. Дзяўчаты рашылі самастойна даганяць сяброў. Яны сталі чытаць, размаўляць, цікавіцца беларускасцю...



Сярод пісьмовых выказванняў (у класе трыццаць вучняў) на тэму патрона школы — Яраслава Кастыцэвіча, допісы дзяўчат не толькі не адставалі ад іншых, нават было ў іх менш памылак чым у ветэранаў. Значыць, найважнейшы падыход да справы! З другога боку — дзяўчаты трапілі ў файны клас. У гімназістаў I „ц” класа шырокія зацікаўленні і ўсе яны любяць чытаць „Зорку”!

**Зорка**



Фота Ганны Кандрацюк

Галерэя „Зоркі” (Беласток)

# Міхась Хмялеўскі

<u>Сярэдняя ацэнка на пасведчанні</u> — 4,87.

<u>Мая мянушка</u> — Хмелю.

<u>У жыцці хачу стаць, чаму</u> — хачу стаць музыкантам і іграць лёгкую музыку. Для мяне музыка — спосаб на добры гумар, на добры адпачынак. Як штосьці іграю, адчуваю сябе проста лепш.

<u>У сяброў цаню</u> — гонар, гумар, добразычлівасць.

<u>Не люблю</u> — восені, хвароб, верасня, біялогіі і баскетбола.

<u>Па-беларуску размаўляю</u> — з сям'ёй і з сябрамі.

<u>Мой любімы гурт</u> — „Н.Р.М.”, „Dżem”.

<u>Каля свайго дому пасаджу</u> — хмель.

№ 48 [27-11-2005]

# Тры Паўліны і Паўл

Тое, што закаханыя маюць празмермую схільнасць да фантазіі — нікому не сакрэт. У прынцыпе, Паўл не любіў ілгунства ды маны. Наадварот, найбольш у сяброў, — як заявіў ён у анкеце для газеты „Клямка” — цаніў шчырасць. Праўда, сам па сабе часта прыдумваў каларытныя гісторыі, аднак, у яго выдумках не было подласці. Часта, што здзіўляла гімназіста, яго гісторыі наклікалі тэму. Умеласць захапляла сябровак. Хлопцы больш крытычна глядзелі на вяшчунскі талент калегі. Апрача добрых навін, Паўл умеў прыцягнуць кантрольную па хіміі або матэматыцы. На ўсякі выпадак хлапец цёрся выключна ля сябровак, яны ніколі не крычалі ды заўсёды хацелі яго зразумець.

— Сёння пагаворым пра Францішка Скарыну, — заявіла ў пачатку ўрока Амелія Гурко, — канкрэтна, пра пражскія гады беларускага першадрукара.

— Нуй *гніце!* — усклікнула Паўліна Б.

— Вой, не! — запішчэла на увесь клас і Паўліна Ш.

Дзяўчаты ўперлі зрок у Паўла. Ён таксама адчуваў, што ў яго моцна б'ецца сэрца і палаюць вушы. Ну так, ізноў „наклікаў”, і пэўна без адзінкі тут не абыдзецца.

— Далоў вашае *гніццё*, — павысіла тон спадарыня Гурко, — ці вы ўжо забыліся, што я не пераношу слэнгу? Выплюньце гэтае слова!

— Ць-фу! — прадэкламаваў увесь клас. Абяцанне нібыта жартам, нібыта ўсур'ёз клас паўтарыў тройчы. Гэта быў іх сакрэтны рытуал, якім пры дапамозе гульні гімназісты чысцілі слоўнік ад смецця і брыдкаслоўя.

Далейшы ход урока замяніўся ў своеасаблівую экскурсію па чэшскай сталіцы. Настаўніца прынесла фотаальбом і даведнікі. На многіх здымках красаваўся помнік Францішку Скарыну.

— Яшчэ ўчора, — сказала яна без ценю іроніі, — я шпацыравала па Карлавым мосце. Каб вы ведалі, як цудоўна зараз у Празе...

Паўл, Паўліна Ш. і Паўліна Ц. не запамяталі нічога, яны сядзелі як зачараваныя і думалі пра раннюю сустрэчу. Хоць, з другога боку, вельмі палюбілі Францішка Скарыну.

(працяг будзе)

**Арабінка**

# Польска-беларуская крыжаванка № 49

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку”. Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

**Адказ на крыжаванку № 45:** Вяз, зык, злом, крос, смех, рака, спеў, жмут, напой, араты, хор, эра, бор, пончык, Ян, палярына, хлеб. Звон, вы, ахова, як, спор, змей, леў, роды, мох, міжрэчча, мары, скрутак, раты, ял, сок, не, сакрэт.

Узнагароды, запісныя кніжкі, выйгралі: **Павел Асіпюк, Юліта Кананюк, Аня Келбашэўская, Агнешка Апольская** з Нарвы, **Наталля Янцэвіч** з Чыжоў, **Паўліна Гіншт, Пётр Герасімюк** з Дубін, **Эвеліна Бірыцкая, Юліта Скепка** з Нараўкі, **Аксана Федарук** з Бельска-Падляшскага. Віншуем!




Міра Лукша

## *Мячык*

*Быў у Мечыка мячык,*
*Ды зваў яго ён іначай:*
*Ён яго „пілкай” называў,*
*Хоць мяч як пілка не скакаў.*
*Гоцаў мячык па падлозе,*
*Гупаў мячык па парозе,*
*Адбіваўся ад сцяны*
*Белы мячык рамянны.*
*Мечык мячык шкадаваў,*
*Гуляць сябрам не даваў,*
*Адзін „пілкаю” гуляў*
*Скупы гэты Мечыслаў!*
*Ды аднойчы сама „пілка”*
*Улавіла адну хвільку*
*Ды ў свет белы паляцела,*
*Бо адной быць не хацела,*
*І адчула, вось, на волі:*
*Пілкай ужо не буду болей,*
*Замянюся ў мяч для птушак,*
*Будуць мяне птушкі гушкаць,*
*І падумае так кожны:*
*У небе новы спадарожнік!*

*Падзарабіць можна было ў час сельскагаспадарчых работ, дагледаючы кароў і дапамагаючы яўрэям. Тады праваслаўных людзей з вёсак амаль увогуле не прымалі на працу ў Гайнаўку. Цягнулі з Польшчы сваіх работнікаў...*

# Людзі ўцякаюць, вёска адмірае



Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

*Рыгор Петручук*



Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

*Аляксандр Шыла*

**У Койлах (Чыжоўская гміна) пасля ліквідацыі цераспалосіцы ў 1937 годзе даход з сельскагаспадарчай прадукцыі пабольшаў. Аднак мала сялян рашылася перасяліцца на хутары і таму некаторыя гаспадары мусілі нават па некалькі кіламетраў даязджаць да сваіх зямельных участкаў. Лепшае поле побач вёскі забралі ў гаспадароў, якія ў пачатку пяцідзесятых гадоў не хацелі ўступаць у калгас. Далі ім горшую зямлю аддаленую ад двароў. Хаця мала людзей падтрымала калектывізацыю, калгаснікі распачалі будову вялікай мураванай аборы, якая стаіць побач вёскі па сённяшні дзень.**

У час ліквідацыі цераспалосіцы каля 30 гаспадароў з Койлаў выбралася з вёскі і пасялілася на сваіх палях. Зараз хутароў вакол Койлаў мала. Дзеці і ўнукі хутаран выехалі на пастаяннае жыхарства ў гарады.

— Пасля ліквідацыі цераспалосіцы намнога лягчэй стала гаспадарыць. Атрымалі мы вялікія ўчасткі поля, але трэба было давесці да парадку аблагі на некаторых палосках. Для людзей, якія хацелі атрымаць лепшае поле, давалі меншую кампенсацыю за зямлю раскіданую ў палосках. Калі гаспадары імкнуліся ўзбуйніць гаспадарку, тады згаджаліся атрымаць зямлю горшай якасці. Часта бывала, што на хутары выязджалі гаспадары з панадворкаў, дзе жыло па некалькі братоў, — кажа Мікола Артэмюк.

Жыхары Койлаў атрымалі лугі далёка ад сядзіб, аж за Рыбакамі. Месца гэтае называлася Граматнае. Часта на траве збіралася вада і толькі ў васьмідзесятых гадах атрымалі яны ўзамен поле побач сядзіб.

— Хаця мы засталіся жыць у Койлах, то поле атрымалі кіламетраў два ад вёскі. Тую зямлю, якая першапачаткова была прызначана нам, атрымаў іншы гаспадар. Пазней мама прадала дом, у якім мы жылі, і за выручаныя грошы купілі поле для майго брата, які аддзяляўся ад нас. Вымушаны мы былі жыць у клуні і на панадворку рыхтавалі харчаванне, — расказвае Аляксандр Шыла. — Хутаране мелі поле вакол сваёй хаты і маглі побач панадворкаў пасвіць кароў. Зараз у гэтых хатах асталося можа трох або чатырох гаспадароў. Усе апошнія жыхары хутароў найчасцей паўцякалі ў Гайнаўку.

## Выехалі з Койлаў

Некалькі гаспадароў з Койлаў рашылася перасяліцца ў Граматнае.

— Гаспадары з нашай вёскі, якія пасяліліся побач нашых лугоў, атрымалі больш поля і хіба гэта было прычынай іх выезду на новае месца. Зараз толькі адзін гаспадар жыве ў Граматным. Усе іншыя выехалі ў гарады або паўміралі, — гаворыць спадар Шыла.

Адно сямейства з Койлаў пасля ліквідацыі цераспалосіцы выехала ў Амерыку.

— Цяжка ім жылося, бо ў іх былі толькі 4 гектары зямлі. У Парагваі яны секлі лес. Іх дзеці заняліся камуністычнай дзейнасцю і іх адправілі ў Расію.

## Цяжка было знайсці працу

У міжваенны перыяд у Койлах была Падставовая школа, у якой вучыліся дзеткі з вёскі і хутароў. Знаходзілася яна ў будынку сённяшняй святліцы і ў доме спадарства Ахрымюкоў.

— У падставовай школе ўсім прадметам мы вучыліся на польскай мове. Калі хвалі Пілсудскага, нам трэба было спяваць польскія патрыятычныя песні, — кажа Рыгор Петручук. — У санацыйнай Польшчы цяжка нам жылося. Падзарабіць можна было ў час сельскагаспадарчых работ, дагледаючы кароў і дапамагаючы яўрэям. Тады праваслаўных людзей з вёсак амаль увогуле не прымалі на працу ў Гайнаўку. Цягнулі з Польшчы сваіх работнікаў. Майму брату ўдалося трапіць на працу ў гайнаўскі тартак. Аднак спачатку яму трэба было працаваць у польскага ваеннага інваліда ў Вульцы. Ён дапамог брату ўладкавацца на працу.

У час II сусветнай вайны савецкія ўлады саставілі спіскі гаспадароў з Койлаў, у якіх было больш поля і іх у першую чаргу мелі саслаць у Сібір.

— Наша сям'я таксама была на спіску ссыльных у Сібір. Калі б немцы не напалі на Савецкі Саюз, мы апынуліся б у Сібіры, — успамінае Аляксандр Шыла. — Жанчына, якая працавала ў 1940 годзе ў савецкай адміністрацыі, назвала нас кулакамі і сабатажнікамі, бо ў нас было 15 гектараў зямлі.

У час абстрэлу вёскі савецкімі салдатамі некалькі дамоў у Койлах было часткова знішчаных. Неадкладна пасля вайны ў Койлы прыехалі савецкія агітатары і сталі ўгаворваць выязджаць у Савецкі Саюз.

— У Расію выехалі тры сям'і. Пасля яны шкадаваліся і гаварылі, што там дрэнна жывецца. Найчасцей траплялі яны ў калгасы. Пазней адна сям'я часцей наведвала Койлы, але яны не маглі ўжо вярнуцца ў Польшчу, — інфармуе спадар Аляксандр.

## Нешматлікія калгаснікі

Калгас у Койлах быў адным з першых у наваколлі і ўлады хацелі, каб дзейнічаў ён прыкладна.

У нашай вёсцы ў калгас запісалася недзе пад 20 гаспадароў. Спачатку калгаснікі паставілі вялікую драўляную пуню, у якой трымалі кароў. Вялікі мураваны свіран пабудавалі побач драўлянага будынка і купілі млынок, паслугамі якога карысталіся таксама аднаасобныя гаспадары. Вялікую мураваную абору пачалі будаваць перад смерцю Сталіна. Маці мая не схацела ўступіць у калгас і зямлю нам памянялі на горшую, — кажа Мікола Артэмюк.

Спачатку зямлю ў калгасе абраблялі коннымі прыладамі. Пасля купілі трактар на жалезных колах і плугі, якімі сталі араць аб'яднанае ў вялікія ўчасткі поле. Пазней дакупілі лепшы трактар на гумавых шынах.

— Я спачатку не хацеў уступаць у калгас, але пасля рашыўся. Кульгаў я пасля палому нагі, то пачаў працаваць на калгасным складзе. У калгасе было многа зямлі і адразу быў прыбытак ад гаспадарання. Аднак пасля калгас раскідаўся, — успамінае спадар Петручук, які ў мінулым любіў чытаць „Ніву" і цікавіўся вясковымі справамі, якія ў ёй апісваліся.

— Здараліся выпадкі, што сын ішоў у калгас і з сабой забіраў палову поля, а бацька абрабляў самастойна апошнюю частку зямлі. Калгас ліквідавалі ў другой палове пяцідзесятых гадоў і нам аддалі наша поле. Недаконачаная абора перайшла на ўласнасць калгаса з Бельшчызны. Пасля яе ўладальнікамі сталі Кааператыў сельскагаспадарчых суполак з Чыжоў і пэгеэр з Новага Беразова. Раней гадавалі ў ёй быдла і свіней, пасля стаялі там бычкі і цяляты. Калі пэгеэр абанкруціўся, абора перайшла ва ўладанне сельскагаспадарчага агенцтва. Я пазней таксама працаваў у аборы і дагледаў за быдлам, — тлумачыць спадар Артэмюк.

Пасля вайны падаткі за зямлю былі вялікімі і ў Койлах здараліся выпадкі, што гаспадары не спраўляліся з абавязковымі пастаўкамі збожжа і мяса.

— Цяжка было гаспадарыць тым, што не ўступілі ў калгас. Трэба было на патрэбы дзяржавы абавязкова пастаўляць сельскагаспадарчыя прадукты, — успамінае Мікола Артэмюк. — Многа працавалі мы на грамадскіх пачатках, будуючы дарогі. У пасляваенныя гады перабудаваны былі дарогі з Койлаў у Курашава і з Койлаў у Новае Беразова. Раней там таксама былі брукаваныя дарогі. Аднак яны былі выкананы на гліне і паразбіваліся ад жалезных вазоў.

Пазней праз Койлы пачалі ездзіць аўтобусы, на якіх моладзь даязджала ў Гайнаўку ў школы і на працу. У вёсцы паволі стала меншаць колькасць жыхароў, якія пераязджалі на пастаяннае жыхарства ў гарады.

Аляксей Мароз

*Сёлета ў снежні спаўняецца 115 гадоў з дня нараджэння беларускага святара-марыяніна Язэпа Дашуты — у гісторыі беларускага рэлігійнага жыцця ён заслужыў пашаны і памяці...*

# Родам з Беласточчыны



Друя. 1932 год. Манастыр айцоў-марыянаў. Язэп Дашута (сядзіць другі злева ў другім радзе)

Пра Язэпа Дашуту напісана мала. Заглянуў я ў энцыклапедычны даведнік „Рэлігія і царква на Беларусі” (Мінск 2001), а раптам там хоць некалькі радкоў будзе пра яго, ды не — няма ніводнага слоўца. Ды што казаць, туды не ўключылі сотню іншых прозвішчаў беларускіх святароў розных канфесій.

Трохі згадвалі пра святара часопісы „Божым шляхам” і „Znič” у 60-х гадах мінулага стагоддзя, Аляксандр Надсан у сваёй выдатнай манаграфіі „Біскуп Чэслаў Сіповіч — святар і беларус” (Мінск 2004) і Юрась Гарбінскі. Праўда, у некаторых гэтых згадках ёсць памылкі. Адны крыніцы, напрыклад, месцам нараджэння называюць Друю, іншыя — Смаленшчыну. А на самой справе Язэп Дашута нарадзіўся ў 1890 годзе ў Саколцы на Беласточчыне ў мяшчанскай сям'і. Спачатку вучыўся ў Сакольскім 4-класным вучылішчы, а пасля ў 1911 годзе скончыў Віленскую духоўную каталіцкую семінарыю. Падчас вучобы быў актыўным сябрам гуртка беларусаў-семінарыстаў. У 1918 годзе Язэп Дашута быў пасвячаны ў святары літоўскім біскупам Францішкам Карэвічам у віленскім семінарскім касцёле.

Сваю душпастырскую дзейнасць наш зямляк распачаў на пасадзе вікарыя ў парафіі Дабжынева Беластоцкага дэканата. Пасля атрымаў дазвол ад віленскага біскупа Юрыя Матулевіча на вучобу ў Люблінскім каталіцкім універсітэце.

Па ініцыятыве таго ж Юрыя Матулевіча ў 1923 годзе ў Друі (цяпер Браслаўскі раён) быў адкрыты беларускі кляштар айцоў марыянаў, куды ў 1925 годзе прыехаў і Язэп Дашута. Пад кіраўніцтвам а. Андрэя Цікоты наш зямляк адбывае год навіцыяту ў Друі і выязджае на далейшую вучобу ў Рым. Там праз год абараняе доктарскую дысертацыю па кананічным праве. Але дзеля сваёй сціпласці ніколі нікому пра гэта а. Язэп Дашута не казаў. Напрыканцы 1927 года ён зноў вяртаецца ў Друю, дзе чакае яго цяжкая душпастырская праца вікарыя, а пасля — пробашча. У адным з пісем да а. Рэклайціса ў Рым Я. Дашута пісаў: „Душпастырскую працу люблю, але пры сённяшніх адносінах суседніх святароў да Друі, асабліва да яе пробашча, працаваць тут незайздросна. Накідаюцца з усіх бакоў”.

Сапраўды, хоць марыяне ў Друі мелі польскую гімназію, хоць не займаліся палітыкай, але і на іх пасыпаліся розныя даносы і націск паліцыі, авантуры ксяндза-скандаліста Бародзіча, якога падтрымлівалі паліцыя і духавенства. Усё гэта звалілася на друйскага суперыёра а. Цікоту і на друйскага пробашча а. Дашуту. Асабліва стала цяжка працаваць друйскім айцам, калі а. Фабіяна Абрантовіча і а. Язэпа Германовіча перавялі ў Харбін, а а. Андрэя Цікоту — у Рым. У верасні 1937 года Язэп Дашута пісаў Андрэю Цікоту: **„Зьяўляецца 17-га верасьня сам начальнік Ваяводзкае Бясьпекі із Старое Вялейкі, нейкі Ясінскі і зь ім Стараста і хочуць бачыць а. Супэрыёра і мяне. Вострым тонам, сказаўшы, хто ён такі, заявіў, што хоча з намі «шчыра, але прыватна» разгаварыцца аб нашых адносінах да дзяржавы. Пачаў гаварыць аб беларускай гімназіі ў Вільні («скамунізаванай»), аб кс. Ад. Станкевічу, аб кс. В. Гадлеўскім і аб нас, што і мы ідзём на ўсход да камуны. На гэта польскі ўрад не пазволіць... Хто нездаволены, то яны (палякі) памогуць прабрацца ў Саветы. «Беларусаў там павыстрэльвалі, а тут вам кепска? Прыдзецца двух-трох ксяндзоў з Друі вывезьці. Вы — прыхільнікі Уніі? На ніякія вуніі не пазволім. Возьмемся і за Альбэртын!»... Запытаў я старасту: дзе болей камуністаў, ці ў нашай парахвіі, ці ў суседаў? А ў начальніка Бясьпекі: ці гаварыць нам ксяндзам па-беларуску да беларусаў, якія да нас у гэтай мове зьвяртаюцца, ці гэта ёсьць ужо здрада стану?.. Што з намі будзе, Бог ведае, на Яго пакладаем усю надзею”** („Божым шляхам”, 1966 г., № 5 (98), с.13-14).



Друя.1935 год. Язэп Дашута (4-ы злева) сядзіць разам з братам Чэслава Сіповіча — Петрусём (злева направа), яго бацькам Вінцэсем, а. Уладзіславам Лысікам, Ядвігай Сіповіч і Чэславам Сіповічам

У пачатку верасня 1938 года польская паліцыя загадала друйскім айцам-марыянам Я. Дашуту, К. Смульку, В. Хамёнку і Ю. Кашыру тэрмінова выехаць з пагранічнае паласы. 9 верасня яны ціха пакінулі Друю. Язэп Дашута выехаў у марыянскі польскі манастыр у Скужэц каля Седльцаў. Але і там ён заставаўся шчырым беларускім святаром, падтрымліваў сувязі з беларусамі з многіх краін свету, а таксама вёў з імі вялікую перапіску.

У гады II сусветнай вайны і пасля вайны наш зямляк жыў у Польшчы і займаўся душпастырскай дзейнасцю ў кляштарах у Грудзёндзу і Влацлаўку. Ён заўсёды быў шчырым чалавекам, вясёлым і добрым. Асабліва тады, калі некаму рабіў нешта карыснае і прыемнае, забываючы пра сябе. Наогул, ён ніколі не любіў расказваць пра сваё жыццё і пра сябе. Больш любіў размаўляць пра справы агульнацаркоўныя і грамадскія, але без палітыкі. Сам жыў паводле канонаў Царквы і ў гэтым духу выхоўваў маладых студэнтаў-клерыкаў, для якіх доўгі час быў духоўным айцом.

Айцец Язэп Дашута пражыў 76 гадоў. Яшчэ ў 1961 годзе ён пісаў Чэславу Сіповічу: „Сяджу тут з Казюком (Смулькам) і зьбліжаемся да прыстані, гдзе спаткаемся з нашымі айцамі Андрэем Цікотам і Фабіянам Абрантовічам. Старасьць і недамаганьне што раз лепей даецца адчуваць. Але я яшчэ трымаюся, а вось а. Казімір ледзь дзержыцца. З трудом перасоўваецца па пакоі і святую службу спраўляець седзячы ды паамацку. Трэба яму памагаць”. Беларускім святарам, сапраўды, было маркотна і крыўдна, што цяпер, калі ўзнікла магчымасць зноў працаваць сярод беларусаў, яны нічым ужо не маглі дапамагчы. Той самы Язэп Дашута пісаў біскупу Чэславу Сіповічу 15 ліпеня 1963 года: „Жутка нам, што ня можам працаваць сярод сваіх і вам памагаць” (Аляксандар Надсан, *Біскуп Чэслаў Сіповіч—сьвятар і беларус*, Мінск 2004, с. 201).

За некалькі дзён да смерці а. Дашуты, Язэп Германовіч занатаваў трохі яго філасофскіх думак і апублікаваў у часопісе „Божым шляхам” (№ 3 (102) за 1967 год). Вось некаторыя з іх: „Думаю аб Ісусе Хрысьце, які стаў для нас хлебам. Перапрашаю Яго за правіны, каб быў мне міласэрным. Ах, Госпадзе Ісусе, люблю Цябе! Дзеля Цябе хачу жыць і паміраць... Цешуся, што Бог пазволіў мне жыць падчас Сабору. Яшчэ сёньня бачу экумэнічную ідэю, дзеля якой я калісьці працаваў, хоць дакладна яе ня знаючы... Айцец Матулевіч яшчэ 50 гадоў таму прадбачыў, што на гэтым Саборы будзе разважацца. Ён так любіў Царкву! Гэта ён прычыніўся да таго, каб я лепш і глыбей пазнаў тайніцу Царквы. Дзеля таго і напісаў ён у Канстытуцыі Закону, што Царкву трэба любіць як матку, а ў патрэбе за яе бяз сумневаньня і жыцьцё аддаць”.

Святар Язэп Дашута моцна любіў Царкву, а ў заходнебеларускім рэлігійным і культурна-асветным жыцці міжваеннага дваццацігоддзя прымаў у ёй самы актыўны ўдзел, а таксама выступаў за шырокае ўжыванне беларускай мовы ў беларускіх каталіцкіх парафіях. Ён памёр 9 верасня 1966 года і пахаваны ў Варшаве.

**Сяргей Чыгрын**



# www.na-bialorus.home.pl

Час на пераломе лістапада і снежня не надта спрыяе вандраванням. Надвор'е большай часткай кепскае, што і падштурхоўвае сядзець дома і займацца якімі-небудзь справамі. Але гэта не значыць, што на рознага кшталту турыстычных вандроўках трэба ставіць крыж. Дзякуючы Інтэрнэту можна, не выходзячы з кватэры, пабываць у іншых мясцінах — далёкіх альбо блізкіх. Адным з такіх „вандроўных" вэб-„турапераtaraў" стаў сайт „Запрашаем у Беларусь", які нядаўна з'явіўся ў сусветным павуцінні і месціцца там па адрасе http://www.na-bialorus.home.pl.

Сайт больш прызначаны для жыхароў Польшчы, асабліва Падляшша, якое непасрэдна мяжуе з Беларуссю, а дакладней з адным з прыгажэйшых яе рэгіёнаў — Гарадзеншчынай. Менавіта неафіцыйная назва вобласці напісана па-беларуску і па-польску на блакітным фоне галоўнай старонкі сайта. Акрамя гэтага надпісу, выяўленне стракаціць фотаздымкамі гарадзенскіх цікавасцей і мае выйсці да беларускамоўнай і польскамоўнай версій.

Распрацоўшчыкі сайта наступным чынам тлумачаць сэнс яго з'яўлення ў сеціве: „На гэтым краязнаўчым сайце вы маеце мажлівасьць знайсьці інфармацыю патрэбную для вандровак па Гарадзеншчыне, пазнаёміцца зь яе рэгіянальнымі адметнасьцямі, багатай гісторыяй гарадоў і мястэчак, турыстычнымі маршрутамі па зямлі Гарадзеншчыны, якія прапануюцца вашай увазе". Што ж прапануе карыстальнікам уласна гэты сайт?

Першая старонка, акрамя вышэйпададзенай інфармацыі, змяшчае вывявы заходнебеларускіх краявідаў і выйсці да іншых рубрык. Размешчаныя яны не ў зусім звыклай для большасці сайтаў форме — зверху і знізу. Па ўсім відаць, што сайт яшчэ знаходзіцца ў перыядзе дапрацоўвання, бо некаторыя ягоныя старонкі, асабліва тыя, выйсці да якіх месцяцца знізу, яшчэ не ўтрымліваюць аніякай інфармацыі. Але тыя, якія ўжо „даведзеныя да розуму", дазваляюць у значнай ступені карыстацца змешчанай на сайце інфармацыяй.

Рубрыка „Рэгіёны" вельмі падрабязна і змястоўна распавядае пра кожны раён Гарадзенскай вобласці. Акрамя тэкстаў аб значных для даных мясцін падзеях і людзях, таксама можна пабачыць фотаздымкі цэркваў, касцёлаў, а таксама гістарычных развалінаў, якімі ганарыцца тая ці іншая мясцовасць.

На старонцы „Гарады" пакуль не багата інфармацыі. Больш падрабязна на момант напісання артыкула можна было даведацца толькі аб Навагрудку і Лідзе. Думаецца, распрацоўшчыкі сайта хуценька папоўняць гэтую бачыну расповедамі аб іншых гарадах Нёманскага краю.

Адной з найболып цікавых старонак сайта ёсць „Турыстычныя маршруты". Тут дэталёва апісваецца якім чынам можна прайсці ці праехаць тым альбо іншым турыстычным шляхам. Гэта ўсё залежыць ад жадання вандроўнікаў і тэматыкі абранага маршруту.

Старонка „Фотагалерэя" змяшчае шэраг фотаздымкаў, якія, праўда, непадпісаныя. Чалавеку не надта знаёмаму з гарадзенскімі краявідамі цяжка зразумець, што гэта за будынкі і якое дачыненне яны маюць да Гарадзеншчыны.

Польскамоўная версія, акрамя дублявання беларускай, утрымлівае інфармацыю аб тым, як даехаць у Беларусь і падае некаторыя нюансы беларускай рэчаіснасці. Таму, карыстаючыся ведамі, узятымі на даным сайце, можна няндрэнна бавіць час на Гарадзеншчыне падчас ужо не віртуальнай вандроўкі.

**Уладзімір Лапцэвіч**



*Тацяна Масквіна (самба) дзесяты раз стала чэмпіёнкай свету па гэтым відзе адзінаборства, заваяваўшы золата ў катэгорыі да 48 кг...*

# Беларусь, беларусы...

**Лістападаўскі плён**

Графік выхаду газеты запатрабаваў падводзіць вынікі месяца за пару дзён да яго завяршэння, але гэта не збядніла выбар лаўрэатаў лістапада. Гэты нудны восеньскі месяц выдаўся дастаткова плённым для беларускіх спартоўцаў.

Камандай месяца назавем мужчынскую дружыну па настольным тэнісе, якая ў драматычным змаганні адолела зборную Расіі — 3:2 і дагнала супернікаў па групе. Наперадзе яшчэ чатыры туры. Паспяхова выступілі і беларускія дзяўчаты, якія ў гасцях упэўнена з сухім лікам разграмілі ўкраінак — 3:0. Беларускі — лідэркі кваліфікацыйнага турніру да Еўра-2007. Далей пяройдзем да індывідуальных намінацый.

1. **Дзяніс Савянкоў** (спартовая гімнастыка) стаў бронзавым прызёрам чэмпіянату свету ў шматбор'і. Жывуць славутыя традыцыі беларускай гімнастыкі! Вышэй гомельскага хлопца апынуліся толькі два спартоўцы з Японіі. Трэба зазначыць, што гэта ўжо трэці медаль Савянкова ў абсалютнай намінацыі на топспаборніцтвах (да гэтага былі дзве бронзы кантынентальных турніраў).

2. **Магамед Нурудзінаў** (бокс) стаў адзіным прадстаўніком нашай краіны, які змог выбіцца ў прызёры чэмпіянату свету, што прайшоў у Кітаі. У выніку на яго рахунку срэбраны медаль у вагавай катэгорыі да 69 кг. Больш ніхто з беларускіх баксёраў не выбіўся нават у чвэрцьфінал.

3. **Уладзімір Самсонаў** (настольны тэніс) у лістападзе напоўніцу выявіў свае творчыя здольнасці. Акрамя дзвюх перамог у камандавым спаборы з расіянамі, ён выйграў адкрытыя чэмпіянаты Расіі і Нямеччыны ў межах серыі Pro Tour. У „калекцыі" Самсонава ўсяго ўжо 12 аналагічных тытулаў.

4. **Андрэй Рыбакоў** (цяжкая атлетыка) на чэмпіянаце свету, што праходзіў у Катары, вырваўшы ў першым практыкаванні 185 кг, заваяваў малое золата і прытым усталяваў новы сусветны рэкорд. На жаль, у штуршку магілёвец не здолеў канкураваць з мацнейшымі штангістамі планеты, стаўшы па суме толькі пятым.

5. **Мікалай Патоцкі** (цяжкая атлетыка) таксама стаў прызёрам сусветнага форуму. Ураджэнец Пінска „ірвануў" жалеза на срэбраны медаль. Штуршок жа праваліў сваім парадкам — у выніку 8-е агульнае месца.

1. **Тацяна Масквіна** (самба) дзесяты раз (!) стала чэмпіёнкай свету па гэтым відзе адзінаборства, заваяваўшы золата ў катэгорыі да 48 кг. Усяго ж на першынстве свету, якое прайшло ў сталіцы Казахстана, беларусы дзесяць разоў ўздымаліся на п'едэстал.

2. **Кацярына Разумава** (дзюдо) стала пераможцай адкрытага першынства Швецыі. Усяго ж беларусы на гэтым турніры заваявалі чатыры медалі рознай вартасці.

3. **Наталля Цылінская** (веласпорт) на стартавым этапе Кубка свету, які прайшоў у Маскве, выразна прадэманстравала, што яе патэнцыял далёка не вычарпаны. Перамогі ў спрынце і гіце — яскравае таму сведчанне.

4. **Юлія Барысік** (самба) у катэгорыі звыш 80 кг заняла другое месца на згаданым вышэй чэмпіянаце.

5. **Валерыя Курыльская** (мастацкая гімнастыка) на апошнім этапе Кубка свету, які прайшоў ва Узбекістане, заваявала бронзавы медаль у шматбор'і.

**Уладзімір Хільмановіч**

# Угодкі Уладзіміра Караткевіча і Слуцкага паўстання ў Вільні





26 лістапада ў Таварыстве беларускай культуры ў Вільні адзначылі 75-я ўгодкі з дня нараджэння Уладзіміра Караткевіча — паэта, пісьменніка, вялікага патрыёта Бацькаўшчыны. Залу ўпрыгожыў партрэт пісьменніка, выпушчаны Таварыствам беларускай мовы імя Ф. Скарыны. А зала Таварыства гэтым разам была перапоўнена, на мерапрыемстве прысутнічалі студэнты Еўрапейскага гуманітарнага універсітэта. Агляд жыцця і творчасці Уладзіміра Караткевіча зрабіла Леакадзія Мілаш, пасля прысутныя паглядзелі відэафільм „Рыцар і слуга". Час бяжыць няўмольна хутка. Здаецца нядаўна адзначалі 70-годдзе, група актывістаў ТБК здзейсніла вандроўку на Радзіму Уладзіміра Караткевіча ў Оршу, потым у Віцебск, наведалі магілу пісьменніка на Усходніх могілках у Мінску і перачытвалі яго творы, кнігі даследчыкаў Адама Мальдзіса і Анатоля Верабея. Як для Караткевіча Максім Багдановіч быў прыкладам маральнай чысціні, духоўнай велічы, так для нас Караткевіч, а яшчэ ён прыклад патрыёта, любові і служэння Беларусі. Па яго творах можна вывучаць айчынную гісторыю.

Так супала, што ў гэтым годзе адначасова адзначалі і 85-я ўгодкі Слуцкага збройнага чыну. Аб падзеях 1920-х гадоў расказаў старшыня ТБК Хведар Нюнька, які зачытаў прывітанне ад прэзідэнта БНР Івонкі Сурвілы. А напрыканцы сабраныя паглядзелі фільм па творах В. Быкава „На чорных лядах".

Так у ТБК у Вільні адзначылі дзве знамянальныя даты, якія пакінулі след у гісторыі Беларусі і маюць служыць прыкладам для моладзі, таму і студэнты Еўрапейскага гуманітарнага універсітэта яшчэ доўга не разыходзіліся, абмяркоўвалі, спрачаліся і пра творчасць, і асобу Уладзіміра Караткевіча, і пра мужнасць паўстанцаў, а потым працягвалася размова пра беларускія справы ў Вільні. Мерапрыемства мела выхаваўчае значэнне для моладзі, яно застанецца ў памяці нашчадкаў.

**Леакадзія Мілаш (Вільня)**

# Шануйма гістарычную памяць

У „Ніве” н-р 46 ад 13.11.2005 г. прачытаў я артыкул Генрыха Рэзніка „Лунаў паўстанцаў дух”. І радуюся, што ёсць яшчэ ў Беларусі людзі, якія шануюць сваю гісторыю, сваіх слаўных сыноў і іх заслугі. Гаворыцца ў ім пра знаных беларускіх паўстанцаў пры сёлетнім святкаванні гадавіны паўстання 1863 года ў Свічлачы: „Людзі едуць з адной мэтай — ушанаваць памяць ваяроў, палеглых за незалежнасць Бацькаўшчыны… Людзі моляцца, ставяць знічкі і ўскладаюць кветкі да помнікаў Кастусю Каліноўскаму і Рамуальду Траўгуту, на магілу Віктара Каліноўскага, які хоць і не дажыў да паўстання, але быў яго ідэолагам і натхняльнікам. Ён ужо тады агучыў беларускую нацыянальную ідэю ў тым выглядзе, у якім яна існуе па сённяшні дзень… Праваслаўныя, каталікі, уніяты, сяляне і шляхта, бедныя і заможныя — усе яны былі аб’яднаныя толькі адной мэтай — свая незалежная Краіна, дзе беларусы самі будуць вызначаць сваю будучыню…”

У гэтых фрагментах і цэлым артыкуле вельмі прыгожанька гаворыцца пра ідэі студзеньскага паўстання і заслугах паўстанцаў. На жаль, мне здаецца, крыху навыраст. Калі і думалі падобна знаныя паўстанцы, то вельмі-вельмі нямногія. Абсалютнай бальшыні з іх не пра незалежную Беларусь хадзіла, а пра адраджэнне Польшчы ў граніцах 1771 года. Значыць, з Беларуссю, Украінай і нават з тагачаснымі па-



радкамі, а правільней кажучы — з беспарадкамі Першай Рэчы Паспалітай. Патрэбныя былі беларускія паўстанцы, без якіх паўстанне не магло быць перамножным — вось і вабілі беларусаў рознымі абяцанкамі.

Віктар і Кастусь Каліноўскія былі тут, на жаль, рэдкім выключэннем, таму так неахвотна гаворыцца і пішацца пра іх у польскай гісторыі. Былі яны моцна радыкальнага і дэмакратычнага напрамку сярод знаных паўстанцаў і даволі радыкальных поглядаў на беларускія нацыянальныя справы. Яны бачылі не толькі патрэбу адраджэння Польшчы, але і грунтоўнага зрэфармавання яе. Ды так, між іншым, яе рэфармаваць, каб усе народы, насяляючыя яе, мелі роўныя правы.

Найважнейшай іх заслугай для беларускага народа было тое, што яны, як ніхто да іх, гаварылі пра беларусаў як народ, нацыю і належныя ім нацыянальныя правы, якіх яны ні ў Рэчы Паспалітай, ні ў царскай Расіі не мелі. Да таго ж гаварылі на мове беларускага народа, да чаго ніяк не могуць дарасці ўлады сучаснай незалежнай Беларусі. Вось менавіта ў гэтым я бачу асноўную заслугу іх для беларускага народа. І за гэта іх любіць і шанаваць нам трэба.

Былі аднак і ў іх грубыя памылкі. А найбольшай з іх — адносіны да праваслаўнай рэлігіі, вернікамі якой і былі ў асноўным беларусы. Назваць праваслаўе сабачай верай, верай маскалёў — гэта недарэчнасць або і зусім дурнота. Беларусы маюць поўнае маральнае права чуцца абражанымі гэтым і не да канца верыць у шчырасць ідэалаў, якія быццам нясло з сабой студзеньскае паўстанне. Праваслаўе не маскоўская выдумка і прыйшло яно на Беларусь не з Масквы і не праз Маскву, а з высокакультурнай Візантыі, якая раней стала хрысціянскай, як Рым. І нічым яно не горшае ад каталіцызму, ці тым больш, ад уніяцтва. Яно найменш адышло ад першага хрысціянства. Па сутнасці праваслаўе і розніца ад каталіцызму менавіта тым, што каталіцызм адкінуў ад першага хрысціянства або да яго дадаў.

Паводле найбольшага каталіцкага аўтарытэту, праваслаўе — гэта другое „лёгкае” хрысціянства…

Што было б, калі б студзеньскае паўстанне перамагло, сказаць цяжка. Сказаць таксама цяжка ці многа скарысталі б беларусы пасля яго перамогі, ці не зусім.

У іншых, апрача рэлігійных, няшчырасцях аднесна беларускіх спраў папракнуць братоў Каліноўскіх, здаецца, не можна. Яны жылі надта каротка і не ўспелі поўнасцю раскрыцца. А вось многіх іншых вядомых паўстанцаў, ранейшых супрацоўнікаў і аднадумцаў Кастуся Каліноўскага, можна і варта, што таксама як бы нейкім ценем кладзецца і на Кастуся Каліноўскага.

*(працяг будзе)*

**Васіль Сакоўскі**

# Туга і кароткая памяць

Наглядзеўся я ў тэлебачанні, як у гадавіну бальшавіцкай рэвалюцыі 1917 года больш паловы расіян тужаць і плачуць па камуністычнай уладзе. Гэты дзень Пуцін аб’явіў рабочым днём, пераносячы свята на 4 лістапада — гадавіну выгнання палякаў з Масквы ў 1612 годзе. Расіянам новае свята не прыстае ні да галавы, ні да сэрца. Большасці рускім Бог не існуе, яны вераць у „правасць і дабрату” Леніна, Сталіна, Брэжнева.

Пры Брэжневе быў на Беларусі (не помню ўжо мясцовасці) такі выпадак: баптысты за свае ахвяраванні пабудавалі малітоўны дом. І на дзень яго адкрыцця запрасілі многіх людзей — вернікаў. Людзі з’ехаліся, а на момант адкрыцця храма пад’ехаў цяжкі бульдозер і развалiў храм роўна з зямлёй.

Раней Ленін і Сталін, не сваімі рукамі, разбуралі храмы рознай веры і высылалі на смерць і катаргу многіх духоўных і мільёны вернікаў; гэта рускія людзі выконвалі такія ганебныя ўчынкі па загадзе зверху. І нечага дзівавацца, што характар і менталітэт рускіх і іншых нацый, што трапілі пад уладу Масквы, амаль нічуць не змяніўся. Старыя, што помнілі той страшны час, амаль ужо павымiралі, а ў тых, што жывуць, закароткая на гэта памяць. А маладым абы толькі добра і лёгка жыць і мінулае іх нічуць не цікавіць. У капіталізме, які завітаў у Расію, трэба цяжка працаваць, а ад гэтага народ даўно ўжо адвык.

**(мп)**

# К. Каліноўскі: герой ці разбойнік?

З вялікай увагай прачытаў я артыкул Васіля Петручука „Не ўводзіць у зман”, дзе ён дае ацэнку і Кастусю Каліноўскаму, і „Большой Советской Энциклопедии”. Пра Каліноўскага пахвальна напісана не толькі ў БСЭ, але і ў іншых даведніках. І ў цяперашняй польскай энцыклапедыі напісана, што Кастусь Каліноўскі быў абаронцам беларуска селяніна і належаў да партыі „Чырвоных”, так як і Валерый Врублеўскі, і іншыя. Значыць і ў польскіх вучоных-энцыклапедыстаў К. Каліноўскі надалей герой.

Аднак я веру спадару Васілю Петручуку, нягледзячы на колішнія нелады між намі. Цікава ведаць, адкуль сп. Петручук зачэрпнуў весткі, што Каліноўскі і яго атрад адрубваў галовы праваслаўным бацюшкам у час паўстання 1863 года. Бо калі гэта праўда, тады любімец энцыклапедыстаў быў проста злачынцам. Хаця бальшавікі ў час рэвалюцыі і пасля яе не тое яшчэ рабілі ў беднай Расіі. І ў іх, бальшавікоў, хто больш ухаўтурыў людзей, той больш быў герой; мо няпраўда гэта?

Яшчэ пры камуне напісаў я ў „Ніву” артыкул пра Кастуся Каліноўскага, дзе выклаў ягоныя грахі, з-за якіх ніякі ён герой, толькі злачынец. І камуністычная ў той час рэдакцыя ў „Нашай пошце” аблаяла мяне з галавы да пят, што я нічога не ведаю і не маю рацыі, а К. Каліноўскі — гэта герой з герояў. І, вядома, мой допіс не быў апублікаваны. Але Васіля Петручука такія непрыемнасці не чакаюць, бо ён літаратар і вучоны, а з такімі лічацца — не тое, што з простым Панфілюком. І слушна піша ён, што царскі рэжым не быў ужо такі крывавы, як раструбілі не толькі бальшавікі, але нават палякі. Каліноўскі мог выратаваць сваю галаву, калі яго ўзялі ў палон, толькі трэба было яму пакаяцца перад царскімі ўладамі, прызнаць свае грахі і даць клятву, што больш такога рабіць не будзе; і быў бы на свабодзе.

А кожная энцыклапедыя можа памыляцца, пра што я ўжо пісаў у „Ніву”. У адным польскім даведніку напісана, што ўласаўцы былі вядомыя ўжо ў снежні 1941 года. Гэта няпраўда, бо хаця здраднікі сярод саветаў напэўна былі ўжо ў той час, але тады не маглі быць уласаўцамі, бо генерал Андрэй Уласаў здаўся ў нямецкі палон 12 ліпеня 1942 года, а да таго часу ён мужна абараняў Кіеў і Маскву. У іншым месцы зноў напісана, што Уласава пасля суда ў 1946 годзе расстралялі савецкія органы, а гэта таксама няпраўда, бо яго павесілі; за добра было б, калі б бальшавікі ўчынілі ганаровую смерць свайму ворагу.

Калісьці я купіў 12-томны даведнік „История второй мировой войны 1939-1941”. І часта стаўляю сабе пытанне, навошта саветы ўводзяць у зман народ, марнуючы столькі паперы. У тых кнігах і словам не згадваецца як Сталін да вайны „прачысціў” камандны склад Савецкай Арміі. Напісана там, як савецкае войска ў вялікім парадку адступала перад гітлераўцамі ў першыя дні вайны. А таго, што яно панічна ўцякала, часта ў адных кальсонах і здавалася ў палон, спадзяючыся атрымаць крыху хлеба, у даведніку няма. Таксама пра падтрымку саветаў саюзнікамі, без якой рускім цяжка было б справіцца з гітлераўцамі, згадваецца даволі памяркоўна. Нічога там няма пра савецка-нямецкія пагадненні і падзел Польшчы. Напісана толькі, што пасля вызвалення ад польскіх паноў 17 верасня 1939 г. у нас наступіла райскае жыццё. Не напісана таксама, што Сталін атрымліваў дакладныя весткі пра час нямецкага нападзення і што загадваў ён расстрэльваць пастаўшчыкоў тых вестак. Не напісана пра жорсткасць маршала Жукава, які ўласнаручна расстрэльваў салдат і афіцэраў. Не напісана, што савецкае камандаванне без аглядкі на колькасць ахвяр ладзіла штурмы пад розныя бальшавіцкія гадавіны.

Мо я памыляюся наконт ацэнкі даведнікаў і наконт ацэнкі Кастуся Каліноўскага. Думаю, аднак, што я Васіля Петручука ні ў чым не абразіў і веру ягоным словам напісаным ці то ў „Ніве”, ці ў яго цудоўных кнігах. А тыя кнігі, што напісаў спадар Петручук, але з-за нястачы грошай ляжаць рукапісамі ў шуфлядах, прапаную рэдакцыі „Нівы” надрукаваць; я першым куплю такія вартасныя творы.

**Мікалай Панфілюк**

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Nakład: 1 700 egz.
Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва”.
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*

*Zrealizowano przy udziale wsparcia finansowego Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.*
Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Сакратар рэд.: Аляксандр Максімюк.
Рэдактар „Зоркі”: Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Ада Чачуга, Паўліна Шафран-Асташэвіч.

Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Камп’ютэрны набор: Яўгенія Палоцкая.
Друкарня: „Orthdruk”, Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: 1. Termin wpłat na prenumeratę na I kwartał 2006 r. upływa 5 grudnia 2005 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch” na terenie całego kraju.

2. Cena prenumeraty na IV kwartał 2005 r. wynosi 26,00 zł.

3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 120,00; pocztą lotniczą Europa — 133,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 147,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH” S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 68124010531111000004430494.

4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,50 zł, a kwartalnie — 45,50 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 4,70 (kwartalnie — 61,10), pocztą priorytetową: Europa — 5,90 (76,70), Ameryka Płn., Afryka — 6,60 (85,80), Ameryka Płd., Środk., Azja — 7,40 (96,20), Australia — 9,60 (124,80). Wpłaty przyjmuje Rada Programowa Tygodnika „Niwa”, Białystok, ul. Zamenhofa 27, nr konta BPH PBK SA Oddział w Białymstoku 77 1060 0076 0000 4011 5001 5504.

# Знак часу



Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

У Хільмонах-Вёсцы маю ўвагу прыцягнуў арыгінальны мураваны склеп з выбітай над дзвярамі датай — 1937. Дата сур'ёзная, а да таго ж — вельмі мадэрная „шавялюра" з пруткоў бэзу. З-за адсутнасці прызнакаў людскага з ім кантакту, палічыў я склеп „пенсіянерам" на заслужаным адпачынку.

Зайшоў я ў суседнюю, найбліжэйшую да склепа, хату. Пажылая яе гаспадыня абмежавала ўжо свой побыт адно да кухні, а дакладней кажучы — да стаячага там ложка. Інтэр'ер памяшкання паказваў, што здаўна не заглядалі туды ніякія маладыя вочы, не craналі жылля ніякія маладыя рукі. Той свет пажылой гаспадыні, без яркіх колераў, быццам ахутвала ўжо імгла. Ажыўляў яго толькі гучны голас нейкага прыёмніка, які сціх запар з маім уваходам у кухню.

Спрабаваў я распытаць гаспадыню пра цікавы мне склеп, што стаяў пад ейным акном. На ўсе мае пытанні адказвала, што нічога яна не ведае. Гэта, мабыць, прымета таго атавізму, што „наша хата з краю".

— Вы хіба ўсё жыццё так цяжка працавалі, — пацікавіўся яшчэ я, — што нават не мелі часу схадзіць на пасідзелкі з суседкамі, каб даведацца якіх-небудзь навін...

— Ой, так. Праца забрала ўсё маё здароўе, усё.

І выведаў я яшчэ ў яе, што склеп суседаў, які жыве праз вуліцу насупраць склепа. Уласнік запаведнага бытавога аб'екта ведаў пра свой помнік даўніны па сутнасці столькі ж, колькі і я з першага погляду. Сказаў мне, што склеп выкарыстоўваецца. Пра дэталі таго карыстання я ўжо не распытваў, бо падалося мне, што чалавека больш турбуюць віртуальныя героі з-за шкляной шырмы, чым ягоная рэальная нерухомасць. Пацікавіўся я толькі, ці ўчэпістыя карані раслін не разрыхляць пастаянна сырога цэменту, але гаспадар адказаў, што такой пагрозы няма.

А сам склеп становіцца не толькі бытавым запаведнікам; ён, здаецца, прымае і ролю прыроднага запаведніка. Бо ж той бэзавы гушчар стварае свайго роду біятоп. Нават на здымку відаць, што з'яўляецца ён цэнтрам грамадскага жыцця вясковых вераб'ёў. Тут яны абмяркоўваюць усе свае навіны, любяцца і чубяцца, разглядаюць планы сваёй будучыні. Гэта ўвосень. А вось навесну, калі ўзнімецца бэзавы водар, з зімовага сну ў лістоўе паўбіваюцца мухаўня, камарня і ўсякая жамяра, над вясковым склепам стане цесна і гаманліва, як у горадзе.

Склепаў, падобных да паказанага на здымку, у наваколлі больш. Яны ўсе з'яўляюцца своеасаблівым знакам нашага часу: зарастання бытавых запаведнікаў прыроднымі.

**Аляксандр Вярбіцкі**

*Шукаеце жонкі, мужа беларускай або ўкраінскай нацыянальнасці? Пішыце:*

**Biuro Matrymonialne**
skr. poczt. 22
**56-100 WOŁÓW**

## „Даўціпы" Андрэя Гаўрылюка

— Як вы правялі канікулы?
— Былі над морам у пансіянаце „Гевонт".
— „Гевонт"? Гэта хутчэй у горах...
— Можа яно і так. Мы ніякім чынам не маглі знайсці пляжа.

* * *

Званок у пункт дарожнай дапамогі:
— Ці можаце кагось прысласць? Папсаваўся самаход...
— А што яму сталася?
— Мабыць вада зайшла ў карбюратар...
— Вада з бензіна?
— Не, з возера. Там цяпер мой самаход, пяць метраў ад берага.

* * *

У судзе:
— Прызнаяцеся да віны?
— Не, высокі суд, я невіноўны!
— Ці вы былі калі пакараны?
— Не, гэта мая першая пакража.

## 04.12 – 10.12

**Баран (20.03. — 19.04.)** Ніхто цябе не абвінавачваць у эгаізме і недахопе ўражлівасці, што часта раней бывала. Адкладзі набок усе справы, якія патрабуюць баявітасці, рашучасці, прадпрымальнасці. Варта пачытаць, наведаць сяброў. Добра зрабіў бы табе кароткі адпачынак.

**Бык (20.04. — 20.05.)** Зробіцца з цябе страшны акуратнік, схочацца павыкідваць усё барахло. Часцей мусіш займацца тым, што неабходнае, на прыемнасці застанецца мала часу. Разбудзешся справы, якая ў апошні час цябе знеспакойвала.

**Блізняты (21.05. — 21.06.)** Будзеш вясёлы і поўны жывучасці. Чакае цябе мілая забава ў мілай кампаніі. Творчы перыяд на працы. Можа трапіць у твае рукі кніга ці артыкул, якія адкрыюць табе вочы на незнаёмы бок жыцця. Поспехі ў фінансах.

**Рак (22.06. — 22.07.)** Дні поўныя ўражанняў, ажыўленне і добры настрой. Ахвота змяніць нешта ў жыцці — памяняй хоць прычоску. Можаш пазнаёміцца з новымі людзьмі ці трапіць у невядомае месца, прысвоіць новыя ўмеласці.

**Леў (23.07. — 22.08.)** Размову з шэфам адкладзі на іншы час — цяпер цяжка будзе вам паразумецца. Шмат навін і крыху замяшання. Звярніся да кагосьці даверанага, хто паможа табе агледзецца ў сітуацыі.

**Дзева (23.08. — 22.09.)** Чакае цябе вельмі цяжкі экзамен ці вопыт — галава ўверх, справішся з ім прыпяваючы. Можаш разлічваць на добрыя нагоды, цікавыя кантакты, ажыўленне ў кампаніі.

**Шалі (23.09. — 22.10.)** Прыйшоў знакаміты час на рэалізацыю нават найбольш шалёных ідэй. Тыдзень працавіты і запоўнены сур'ёзнымі заданнямі. Развееш сумненні. Унутраны спакой. Насі чырвонае — вібрацыя колеру разбудзіць жарсці і эмоцыі.

**Скарпіён (23.10. — 21.11.)** Замест праколваць іншых сваім джалам, акажаш ім дапамогу і зразуменне. Можаш заблытацца ў справы, якімі не маеш ахвоты займацца. Можа не хапіць часу для цябе самога. Крыху слабейшае здароўе, раздражнёнасць, унутраны неспакой.

**Стралец (22.11. — 21.12.)** Калі атрымаеш цікавыя прапановы, прымай іх усляпую! Не выкручвайся ад падарожжаў, удзелу ў канферэнцыях, курсах, вучэннях — прынясуць карысць. Новыя магчымасці. Цяжка дагаварыцца з Рыбамі.

**Казярог (22.12. — 19.01.)** Дзякуючы Венеры добра памесціш свае пачуцці. Маеш шанц на пажыццёвае каханне. Тыдзень сімпатычны, „на люзе". Смела бяры на сябе абавязацельствы. Новыя знаёмствы будуць моцныя. Насі срэбны колер — пад дасць гумару і новых ідэй.

**Вадалей (20.01. — 18.02.)** Адчуеш сябе ўшанаваным і патрэбным. Новая прапанова можа адмяніць тваё прафесійнае жыццё. Можаш спадзявацца ўсяго, апроч нуды. Новыя знаёмствы, аднаўленне старых.

**Рыбы (19.02. — 19.03.)** Зашмат узялі вы на сваю спіну. Навучыцеся адмаўляць! Энергія, адвага, добрыя ідэі. У ваша жыццё ўвойдзе новая тэхніка. Насіце адзенне ў блакітным колеры — набярэце дыстанцыі да праблем.

**Агата Арлянская**

## Шыфраграма

Літары адгаданых слоў, перанесеныя згодна з іх парадкавымі нумарамі ў клеткі роспісу, складуць рашэнне — афарызм св. Бернара Клервоскага.

1. горад у Венгрыі, каля якога Дунай мяняе цячэнне з шыротнага на мерыдыяльнае = 24 _ 25 _ 13 _;
2. дзяржава і востраў на ўсход ад Кубы з Порт-о-Прэнс = 3 _ 4 _ 10 _ 40 _ 41 _;
3. шлюб мужчыны = 33 _ 35 _ 34 _ 36 _ 42 _ 43 _ 44 _ 45 _;
4. жоўтая вадкасць, якую печань выдзяляе ў кішэчнік = 17 _ 22 _ 23 _ 26 _ 27 _;
5. любіць узяць = 8 _ 16 _ 15 _ 14 _;
6. рака ў Чэхіі, да якой уліваецца Влтава, і якая ў Германіі становіцца Эльбай = 46 _ 12 _ 1 _ 2 _;
7. новасібірская рака = 32 _ 9 _;
8. Ян Жыжка або Дон Кіхот = 29 _ 30 _ 5 _ 39 _ 38 _;
9. бойкі, хвацкі чалавек = 21 _ 31 _ 20 _ 28 _;
10. перыяд палавой актыўнасці ў самак млекакормячых = 6 _ 7 _ 48 _ 18 _ 19 _;
11. пераноснае конусападобнае жыллё ў некаторых народаў Цэнтральнай Азіі, крытае шкурамі = 47 _ 11 _ 37 _ 49 _. **(ш)**

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

## Адгаданка



**Адказ на адгаданку з 43 нумара**

Вецер, газ, зад, пік, сум, Тычына, цаца, час, Японія.

Рашэнне: **Сусветны мір пачынаецца з дзіцячага пакоя.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Аляксандру Дабчынскаму** з Беластока і **Мікалаю Сазановічу** з Навін-Вялікіх.

ISSN 0546-1960